ПРАЛЕТАРЫ УСЁХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 70 (4322)
ПАНЯДЗЕЛАК, 28 сакавіка 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Вышэй тэмпы перабудовы работы прафсаюзаў. — В. ЗАЛАТУХІН — На грэбні ўздыму культурнай рэвалюцыі. (2-я стар.).

Дакладнай падрыхтоўкай да сяўбы забясьпечым павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў.

Японска-кітайскія «мірныя» перагаворы — на мёртвым пункце. — Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) — Пабудова новых дамоў для спэцыялістаў. — Пастанова ЦК УсеКП(б) — Аб прымусовым аграмаджаньні жывёлы (1 стар.).

Правільна пабудаваць вытворчую брыгаду — верны спосаб арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Шырэй выкарыстаць вольны дрыгы. (2-я стар.).

Рамонт мэханізмаў і вярбоўку рабочых-тарфяноў — на ўдарныя тэмпы. — Партыйна-масавую работу ў часьцях РСЧА — на службу ўзмацненьню баявой падрыхтоўкі. — Рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна — у цэнтр увагі калдагаворнай кампаніі.

АГЛЯД ДРУКУ. — Створым мастацтва, вартае эпохі (3-я стар.).

У чыгуначныя прафорганы выбраць лепшых ударнікаў транспарту.

Фашысцкая Польшча дамагаецца вазьмі ў Францыі. Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі. (4 стар.).

Вышэй тэмпы перабудовы работы прафсаюзаў

VII зьезд прафсаюзаў Беларусі, які закончыў сваю работу, падвёў вынікі работы і барацьбы прафесыянальных саюзаў за ажыцьцяўленьне пяцігодкі за 4 гады, за будаўніцтва сацыялізму. Гэты шлях быў пройдзен з вялікімі цяжкасьцямі, у жорсткай барацьбе з антыпартыйнымі элементамі, са спад чыннай старога праваантыпартыйнага кіраўніцтва УсеЦСПС, з косасьцю, бюракратызмам, апалітычнасьцю і цэхаўшчынай у паасобных зьвеньнях прафесыянальнага руху.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе Цэнтральнага камітэту прафесыянальны рух Беларусі прышоў да свайго VII зьезду з дасягненьнямі і прадэманстраваў перамогу ленінскай нацыянальнай палітыкі.

БССР нажывае зараз каля 100 тысяч індустрыяльных рабочых, 348 тысяч членаў прафсаюзаў. Ці гэта не перамога вялізарнага палітычнага і гістарычнага значэньня?

Побач з хуткім колькасным ростам прафсаюзаў Беларусі ўзрастала і якасьць іх работы. Узрасла іх арганізуючая роля ў барацьбе за выкананьне вытворчых праграм на аснове дырэктывы XVI зьезду УсеКП(б) аб паваротце тварам да вытворчасьці. Гэты паварот быў забясьпечан перабудовай работы прафсаюзаў значным узмацненьнем канкрэтнага кіраўніцтва вядучымі зьвеньнямі.

Гістарычная прамова тав. Сталіна аб новай абстаноўцы і новых задачах гаспадарчага кіраўніцтва (6 умоў тав. Сталіна), якая знаўлецца бальшавіцкай праграмай сацыялістычнага будаўніцтва, узняла найвялікшую хвалю энтузіязму і актыўнасьці ў рабочай клясе, зрушыла наперад гаспадарчае кіраўніцтва. Гэтыя 6 умоў перамогі знайшлі сваё канкрэтнае праламленьне ў рабоце раду прадпрыемстваў Беларусі («Пралетары», «Бальшавік», фабрыка «Кастрычнік», лесазавод імя Молатава і інш.).

Прафсаюзы маюць дасягненьні і на такіх важнейшых вучастках, як паляпшэньне матар'яльнага становішча рабочай клясы, культурнае будаўніцтва (ліквідацыя нясьпісьменнасьці, рост клюбаў, рабочых тэатраў, курсаў і г. д.), барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам, галоўнай небясьпекай, з беларускім шавінізмам, з шавінізмамі розных масьцей, інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых мас.

Посьпехі прафсаюзаў Беларусі бясспрэчныя, але цельга прайсьці міма раду буйнейшых недахопаў у іх рабоце, якія адзначыў зьезд у сваіх пастановах.

Барацьба за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсёй прафсаюзнай работы. Трэба весьці рашучую барацьбу з тымі, хто правядзеньне гэтых 6 умоў зводзіць да «кампаніі», забываючы, што толькі яны забясьпечаць нам посьпех у ажыцьцяўленьні пяцігодкі за чатыры гады, што толькі яны забясьпечаць нам максымальныя тэмпы ў другой пяцігодцы. Прафесыянальныя арганізацыі павінны памятаць, што зроблены толькі першыя крокі, што прадстаіць вялікая напружаная работа для ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна. У дакладзе ЦСПСБ на зьезьдзе прафсаюзаў прыведзены досыць пераканаўчыя факты, гаворачыя аб тым, наколькі яшчэ мала зроблена каб 6 умоў тав. Сталіна сталі акрэсьліваючымі ва ўсім гаспадарчым кіраўніцтве, пачынаючы з трэсту і аб'яднаньня і канчаючы брыгадай.

Ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна ў значнай ступені залежыць ад якасьці прафсаюзнага кіраўніцтва. «Паварот тварам да вытворчасьці» азначае канкрэтнае кіраўніцтва з боку прафсаюзаў найвялікшым удымам рабочай клясы, сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, за павышэньне сацыялістычнай дысцыпліны працы, за павышэньне прадукцыйнасьці працы, і паляпшэньне якасьці прадукцыі» (Швэрнік, даклад на XVI зьездзе). Вось чаму ў дакладзе ЦСПСБ зусім правільна адзначана, што «мы павінны ўзьняць якасьць усёй нашай работы, зрабіць гэту праблему цэнтральнай, вузлавой». Ва ўдарную брыгаду, групу, зьмену, цэх, у гэтыя нізавыя першапачатковыя зьвеньні — вось куда павінен быць перанесен цэнтр цяжару работы прафсаюзаў.

Работа па паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы—слабае месца ў рабоце многіх нашых прафарганізацый. У гэтай галіне прадстаіць яшчэ вялізарная работа. Прафарганізацыі павінны стаць бліжэй да каапэратыву, магазыну, сталовай і іншых прадпрыемстваў, якія абслугоўваюць матар'яльна - бытавыя патрэбы рабочых. Ня толькі словам, але і справай, штодзённым кантролем і праверкай выкананьня трэба паляпшаць работу каапэрацыйных, камунальных і іншых сацыяльна - бытавых арганізацый. Трэба памятаць, што паляпшэньне матар'яльна - бытавых умоў рабочай клясы грае вялізарную ролю ў выкананьні прамфінпляну і ўсяго народна - гаспадарчага пляну. Толькі наскрозь праніўшыя бюракраты могуць ігнараваць справу паляпшэньня матар'яльна - бытавых умоў рабочых. Дэлегаты зьезду прывялі досыць фактаў дрэннай работы каапэрацыі, дрэннага кіраўніцтва ёю з боку асобных прафарганізацый, нежаданьня многіх ЗРК займацца самазагатоўкамі, ігнараваньня гэтай важнейшай задачы, безгаспадарчасьці ў прыгарадных гаспадарках. Прафарганізацыі павінны павесьці рашучую барацьбу з акасьцянелымі элементамі ў каапэрацыйных арганізацыях, выгнаць адтуль апартуністаў, якія супраціўляюцца разгортваньню савецкага гандлю і скрыўляюць палітыку цэн.

Патрэбна таксама рашучая барацьба з тымі, хто скарыстоўвае не па прызначэньні асыгнаваньні, адпушчаныя на сацыяльна - бытавыя патрэбы рабочых.

Тэмпы перабудовы заработнай платы яшчэ нязначныя і павінны быць узмоцнены. У радзе прадпрыемстваў яшчэ дагэтуль ня зжыта «лявацкая» ўраўнілаўка, якая павышае сабекошт прадукцыі і павялічвае цякучасьць рабочай сілы. Таму барацьба за правільную арганізацыю праграсыўна - прэміяльнай зьдзельшчыны застаецца і на бліжэйшы час важнейшай гаспадарча - палітычнай задачай прафсаюзаў. Найменшыя перагібы і скажэньні ў гэтай галіне павінны зжывацца з усёй рашучасьцю.

У галіне культурнай работы і палітычнага вызваленьня рабочых, у асабліваасьці новых кадраў, якія толькі нядаўна прышлі на фабрыкі і заводы, зроблена вельмі мала. Культурная работа ва многіх мясцох не пашыўнена тым размахам, якога патрабуе партыя ў сваіх неадназразовых рашэньнях. Аб гэтым многа гаварылі дэлегаты зьезду. Апалітычнасьць, вузкае культурніцтва — гэтыя парокі, што засталіся ад старога, праваапартуністычнага кіраўніцтва УсеЦСПС, да канца яшчэ ня зьнішчаны. «Культурна - палітычная работа прафсаюзаў толькі тады будзе на патрэбным узроўні, калі з дня ў дзень стане правадніком генэральнай лініі партыі і ўзьніме найбольш адсталыя пласты рабочых да зразуменьня агульна - клясавых задач пралетарыяту». Гэта дырэктыва партыі, выказаная ў дакладзе тав. Швэрніка на XVI зьезьдзе партыі, часта забываецца некаторымі прафработнікамі.

9.734.000 рублёў вызначана прафсаюзамі БССР на культработу ў 1932 годзе. Гэта сума павінна цалкам забясьпечыць шырокае разгортваньне культурна - палітычнага выхаваньня членаў прафсаюзаў. Трэба толькі ўмець рацыянальна іх скарыстаць і паляпшаць якасьць культурнай і палітычнай работы.

На зьезьдзе прыводзіліся факты заціску самакрытыкі ў асобных прафарганізацыях. Гэта гаворыць за тое, што яшчэ ня ўсюды самакрытыка стала тым вагаром, які прыводзіць у рух вялізарныя пласты працоўных па барацьбу за сацыялістычнае будаўніцтва.

Прафсаюзы павінны праяўляць пай большую чуласьць да голасу рабочых мас, якія крытыкуюць тыя ці іншыя недахопы ў гаспадарчым і прафсаюзным кіраўніцтве. Зажымшчыкі самакрытыкі павінны сустракаць самы жорсткі адпор і прыцягвацца да суровай адказнасьці. Толькі праз шырока разгорнутую крытыку і самакрытыку мы палепшым якасьць прафработы.

У значна большай меры, чым дагэтуль, трэба аддаваць увагу вайсковай рабоце. Прафесыянальныя арганізацыі часта ўспамінаюць аб гэтай рабоце ў гадавіну Чырвонай арміі, або ДНУ. Трэба дабіцца таго, каб вайсковай прапагандай была прасякнута ўся культурна - палітычная работа, якая праводзіцца кожны дзень. Вайсковая работа прафсаюзаў зараз набывае асабліва актуальнае значэньне. Супярэчнасьці, як унутры капіталістычнай сыстэмы, так і паміж капіталістычнай і сацыялістычнай сыстэмамі усё больш і больш абвастраюцца. Капіталістычны сьвет шукае выхаду з эканамічнага крызісу ў вайне супроць СССР. У гэтым нас усё больш і больш перакоўваюць падзеі апошніх год. Таму, кожны член прафсаюзу павінен быць палітычна і тэхнічна падрыхтаваны да абароны краіны, якая будуе сацыялізм.

XVII усесаюзная партыйная канфэрэнцыя паставіла перад партыяй, а значыцца перад яе асноўным прыводным пасам — прафсаюзамі вялізарную палітычную задачу «канчатковай ліквідацыі капіталістычных элементаў і клясаў наогул у другую пяцігодку». Таму, «на прафсаюзы, як на самыя шырокія масавыя пралетарскія арганізацыі, у першую чаргу кладзецца задача — мабілізаваць і арганізаваць масы вакол задач будаўніцтва сацыялістычнага грамадзтва, якое можа быць створана і ўмацавана толькі намаганьнямі мільёнаў працоўных» (з пастановы XVI зьезду УсеКП(б).

Прафесыянальны рух Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе цэнтральнага камітэту пасьля свайго VII зьезду будзе яшчэ больш рашуча змагацца за генэральную лінію партыі, вядучы бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам галоўнай небясьпекай, з «левым» апартунізмам і з прыпіўнцтвам да ўсякіх ухіленьняў ад лініі партыі. Уся работа прафсаюзаў зьнізу да верху павінна быць узьнята на такі ўзровень, які адпавядае вялізарным задачам пабудовы бязьклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

ДАКЛАДНАЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА СЯЎБЫ — забясьпечым павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў

Кандыдат на пяршынства

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Калгас імя Будзённага, Варонідага сельсавету, — кандыдат на пяршынства ў спаборніцтве па лепшую і хутчэйшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

План сяўбы падраблена абмяркован па сходах калгасьнікаў, якія высунулі сустрэчны ў 23 га. Калгас ужо поўнасьцю ссыпаў насенныя і страхавы фонды. Усё насеньне ачышчана і адсартавана. Таксама забраніраваны фуражны фонд на ўвесь час палявых работы.

У калгасе арганізавана 8 брыгад, з іх 3 паляводчых. Да кожнай брыгады прымацован поўны вучастак зямлі, сельска-гаспадарчы інвэнтар і пятавая сіла. Калгас ужо скончыў рамонт с.-г. інвэнтару.

Шустры.

Інвэнтар і цягавая сіла прымацаваны да брыгад

КАПЫЛЬ. (Наш кар.). Калгас «Ульянава», Ляшнянскага сельсавету, па-бальшавіцку падрыхтаваўся да сяўбы. Рамонт с.-г. інвэнтару скончан. Увесь інвэнтар і конская цягавая сіла прымацаваны да вытворчых брыгад. На час палявых работ ужо складзен фуражны фонд з 35 цэнт. сена і 25 цэнт. аўса.

Насенныя і страхавыя фонды поўнасьцю ссыпаны і адсартаваны. Калгасьнікі высунулі сустрэчны план у 9 га, якія таксама забясьпечаны патрэбным насеньнем.

На прыкладзе калгасу «Чырвоны дырыжабль», калгас «Ульянава» вызначыў 3 цэнт. для міжкалгаснай насеннай дапамогі.

В.

Спажывецкія тэндэнцыі не сустракаюць адпору

РЭЧЫЦА. У Нахаўскім сельсавеце ў падрыхтоўцы да сяўбы пануе поўны самацёк. План веснавой сяўбы да калгасаў і вёсак даведзен фармальна.

Райзямаддзел над выглядам розных нядобных зямель скараціў насеўную плошчу па Нахаўскім сельсавеце на 300 га. Калгасьнікі і аднаасобнікі ня ведаюць, колькі і чаго яны павінны сеяць.

Паасобныя калгасы пры недахваце насеньня тэй ці іншай культуры ідуць па лініі найменшага супраціўленьня. Напрыклад, у калгасе «Чырвоны араты» не хапае 6 цэнт. насеньня ільну і 7 цэнт. капапель. Замест мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, якія бязумоўна ёсьць у калгасе, праўленьне на чалі з старшынёй Навіцкім выносіць «мудрую» пастанову: замест ільну і капапель сеяць авёс і грэчку. Гэтыя яўна кулацкія «аўсяныя» тэндэнцыі не сустракаюць адпору з боку сельсавету і партыйнай ячэйкі.

Пастанова Белкалгасцэнтру аб арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад сярод калгасьнікаў не папулярызавана.

Брыгада «Зьвязды»:

Нікіцін, Паляры.

Назначыць у якасьці брыгадзіраў — лепшых ударнікаў

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Пастановы партыі аб брыгадзе, як асноўнай форме арганізацыі працы, знайшлі жывы водгук сярод перадавых калгасаў Бабруйшчыны.

Калгас «Глуша», Рымавецкага сельсавету, па сваім сходзе вынес пастанову неадкладна прыступіць да арганізацыі дзьвюх пастаянных паляводчых і аднэй агароднай брыгады, да 25 сакавіка прапрацаваць вытворчыя заданьні, правільна расставіць рабочую сілу, прымацаваць да кожнай брыгады неабходную колькасьць с.-г. інвэнтару і коняй.

Калгасьнікі абавязалі праўленьне назначыць у якасьці брыгадзіраў лепшых ударнікаў. Сход пастанавіў з 20 па 25 сакавіка правесьці пяцідзённік масавай праверкі падрыхтаванасьці калгасу да сяўбы, а 25 паладзіць пробны выезд у поле.

Актыўна ўзяліся за арганізацыю вытворчых брыгад калгас імя Блюхэра, Варатынскага сельсавету, «Сьвет», Баравіцкага сельсавету і інш.

А. Магідаў.

20 сельсаветаў ня ссыпалі страхавых фондаў

КРУПКІ. Ссыпка насенных і страхавых фондаў — самы адсталы вучастак работы ў раёне. На 20 сакавіка план ссыпкі па збожжавых выканан на 58,4 проц., па бульбе — на 50,6 проц. Яшчэ горш ідзе ссыпка насеньня тэхнічных культур — 16,22 проц.

20 сельсаветаў зусім яшчэ не прыступілі да ссыпкі страхавых фондаў. Бязьдзейнасьць раду арганізацый, разважаньні аб «немагчымасьці» мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў прывялі да таго, што Крупічына яшчэ да вясны не падрыхтавана. Ачыстка насеньня ідзе зусім нездавальняюча. Па калгасах ачышчана толькі 17,32 проц. Па аднаасобным сэктары прыступілі да ачысткі толькі два сельсаветы — Шэйскі і Выдрацкі. Такое важнае агрэгарапрыемства, як вывазка гною, выканана калгасамі па 0,27 проц.

Брыгада «Зьвязды».

Засыпка скончана, зборнасеньні працягваецца

ЦЕРАХАЎКА. Калгас «Церахаўка», ажыцьцяўляючы мерапрыемствы партыі ў галіне мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў насеньня, поўнасьцю ссыпаў насенныя і страхавыя фонды. Калгасьнікі, выклікаючы адзін другога, сабралі праз аблігацыі 11,5 цэнт. бульбы і 3 цэнтнэры насеньня збожжавых культур.

Шатрукоў.

Гатовы сустрэць сяўбу

ПУХАВІЧЫ. Калгас імя Кіорына пры абгаворанні ўстановы плану, пасланага райкалгасаюзам, высунуў свой сустрэчны план і павялічвае яравы клін па 23 га.

Насеннфонды ў калгасе ссыпаны і ачышчаны поўнасьцю.

Стварыўшы брацінаныя кармавыя фонды калгас пазычыў кармы вакольчым калгасам, якім не хапала каля 3.000 пудоў сена.

Адрамантаваны таксама ўвесь інвэнтар і збруя. Калгас падрыхтаваны і ў поўнай гатоўнасьці чакае веснавую сяўбу.

Брыгада: **Самуськевіч, Падабедзенка, Падаляка, Чаркін.**

ЯПОНА-КІТАЙСКІЯ „МІРНЫЯ" ПЕРАГАВОРЫ НА МЁРТВЫМ ПУНКЦЕ

63-тысячная японская армія ў Шанхаі — напагатове

ПЕРАГАВОРЫ НІ НА КРОК НЕ ПАСУНУЛІСЯ НАПЕРАД

НАНКІН, 25. У інтэрв'ю з прадстаўнікамі друку міністар замежных спраў нанкінскага ўраду Ло Вень-кань заявіў, што Кітай хоча заключыць мір з Японіяй па базе пастаноў Лігі нацый ад 11 сакавіка, якія прадугледжваюць спыненьне варожых дзеяньняў і эвакуацыю японскіх войск.

На пасяджэньні мірнай канфэрэнцыі ад 24 сакавіка японцы прапанавалі перагледзець умовы, высунутыя Лігай нацый, ад чаго кітайскія дэлегаты адмовіліся. Таму, — сказаў Ло Вень-кань, перагаворы не пасунуліся наперад. Далей Ло Вень-кань адзначыў, што становішча ў Манчжурыі яшчэ больш ускладнілася ў выніку стварэньня так званай манчжурскай дзяржавы.

Мы расчараваны публічнай заявай аднаго адказнага дзяржаўнага дзеяча прыязнай дзяржавы, якая зрабіла намылку, разглядаючы новую манчжурскую дзяржаву нараўні з іншымі дзяржавамі. Тым ня менш, мы спадзяемся, што дзяржавы будуць разглядаць Манчжурыю, як непадзельную частку Кітаю.

ЯПОНЦЫ ВЫСОУВАЮЦЬ УСЁ НОВЫЯ ПЫТАНЬНІ

ШАНХАЙ, 25. Раніцнае пасяджэньне «мірнай канфэрэнцыі» зноў было прысьвечана агульнаму абмеркаваньню ўмоў, якія былі прыняты на папярэдніх неафіцыяльных канфэрэнцыях. Работы канфэрэнцыі вельмі марудна прасоўваюцца наперад з прычыны пазыцыі, заняй Японіяй. Ўказваюць, што японцы перад прыняцьцем рэзалюцыі ўзьнімаюць шмат зусім лішніх пытаньняў. Абедзьве дэлегацыі адмаўляюцца паведаміць аб тым, якія пункты падлягаюць абмеркаваньню і выраішэньне якіх пытаньняў сустракае затрудненьні.

Акупанты згодны адвесьці войскі толькі да лініі Усун-Шанхай

ТОКІЁ, 26. «Ніцы-ніцы» ў паведамленьні з Шанхаю зазначае, што Чан Кай-шы пастанавіў на словах заняць рашучую пазыцыю з тым, каб процідзейнічаць узрастаючаму незадаваленьню супроць Нанкіну ва ўсім Кітаі.

У ваенным міністэрстве карэспандэнту «Ніцы-ніцы» заявілі, што Японія дамагаецца адводу японскіх войск, толькі да лініі Усун-Шанхай.

У Шанхаі сканцэнтравана 63 тысячы японскіх войск

НАНКІН, 25. Згодна пісьмовых справак, якія перададны прадстаўніком другу, у Шанхаі вакол гораду разьмешчана 63.000 японскіх войск, 60 бранявых машын і 160 ваенных самалётаў.

МАГЧЫМАСЬЦЬ ЗРЫВУ „МІРНЫХ" ПЕРАГАВОРАЎ

БЭРЛІН, 26. Паводле паведамленьняў шанхайскага карэспандэнта бэрлінскага газэтнага канцэрну Ульштэйна, кітайска-японскія перагаворы знаходзяцца на мёртвым пункце і, відавочна, скончацца без рэзультатаў. Японцы апублікавалі праект згоды, у якім высоўваюцца патрабаваньні аб часовым пакіданьні японскіх войск у раёнах, што мяжуюцца з міжнародным сэтльмэнтам. Сярод насельніцтва раду кітайскіх гарадоў вялікае хваляваньне. Сур'ёзныя сутычкі мелі месца ў паўночных кітайскіх гарадох. Шмат параненых. На рацы Янцзы ўсё яшчэ стаяць 93 японскія ваенныя судны. Ёсьць чуткі, што Японія зноў прадпрыме ваенныя дзеяньні, матывуючы іх арыштамі 4-х японскіх грамадзян па абвінавачаньні ў шпіянажы. (ТАСС).

Націск Японіі на Лігу нацый

Пагрозы выступіць са складу Лігі

ТОКІЁ, 26. «Ніцы - ніцы» і «Кокумін» сэнсацыйна паведамляюць, што ва ўрадавых колах усё больш схіляюцца да думкі аб неабходнасьці выхаду са складу Лігі нацый, улічваючы, што «Ліга нацый нічога ня смысліць у кітайскім пытаньні.» Газэта «Кокумін» піша:

«Малыя краіны не зацікаўлены ў выраішэньні японска-кітайскага канфлікту і па эгаістычных меркаваньнях дабіваюцца лігаральнага ажыцьцяўленьня статуту Лігі нацый. У той жа час Японія, зьяўляючыся членам Лігі нацый, «пазбаўлена магчымасьці весьці перагаворы з Кітаем без удзелу Лігі нацый». Газэта дадае, што «прабываньне ў Лізе нацый несумяшчальна з пан-азіяцкім рухам».

«Ніцы-ніцы» сазначае, што па думцы ўрадавых колаў, Японія павінна або фармальна паведаміць Лігу нацый аб выхадзе з яе складу, або проста адклікаць японскіх прадстаўнікоў з Лігі і тым самым практычна ажыцьцявіць выхад. Паводле слоў «Ніцы-ніцы», урадавыя колы цьвёрда пастанавілі скончыць з «цяперашнім тупіком».

Усе газэты, а таксама агэнцтва Сімбун Рэнга сьцьвярджаюць, што пытаньне аб выхадзе Японіі з Лігі нацый сур'ёзна абгаварваецца ўрадавымі коламі. Сімбун Рэнга асабліва падкрэсьлівае, што ў міністэрстве замежных спраў і ў ваенным міністэрстве рашуча падтрымліваюць праект выхаду Японіі з Лігі.

Па думцы аўтарытэтных колаў кампанія выклікана нядаўнім паведамленьнем Друмонда Сато, што Ліга нацый на падставе 15 артыкулу статуту прапануе кітайскаму і японскаму ўрадам безадкладна прыступіць да непасрэдных перагавораў па манчжурскім пытаньні і што ў выпадку правалу перагавораў Ліга нацый сама возьмецца за выраішэньне гэтага пытаньня. У японскіх урадавых колах катэгарычна супярэчаць застасаваньню 15 артыкулу да Манчжурыі. Гэтыя-жа колы мяркуюць, што пагражаючы развалам Лізе шляхам выхаду з яе, Японія прымусіць дзяржавы хутчэй дагаварыцца з Японіяй па кітайскім пытаньні і, у прыватнасьці, па пытаньні аб Манчжурыі.

У інтэрв'ю з карэспандэнтам «Ніцы-ніцы» **Аракі (ваенны міністар)** заявіў, што **Японія не дазволіць трэцяму баку парушаць парадак у Манчжурыі і не пацерпіць умяшаньня трэцяга боку ў манчжурскае пытаньне наогул.** Далей Аракі заявіў, што дзейнасьць камісіі Літтона пакажа, ці мае Ліга нацый права займацца далёка-ўсходнімі пытаньнямі. Калі рэзультаты работы камісіі аказуцца нездавальняючымі,—дадаў Аракі,—і выявіцца неразумеьне Лігай далёка-ўсходняга пытаньня, дык Японія выйдзе са складу Лігі.

У заключэньне Аракі зазначыў, што выхад Японіі будзе азначаць, што Ліга нацый пазбаўлена права займацца пытаньнямі ўстанаўленьня міру на Далёкім Усходзе, што прывядзе да крызісу ўнутры Лігі.

АБ ПРЫМУСОВЫМ АГРАМАДЖАНЬНІ ЖЫВЁЛЫ

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка 1932 г.

У радзе раёнаў наглядаецца практыка аграмаджаньня кароў і дробнай жывёлы ў паасобных калгасьнікаў фактычна прымусовымі спосабамі, што самым грубым чынам парушае неаднаразовыя ўказаньні Цэнтральнага Камітэту партыі і статуту с.-г. арцелі.

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што толькі верагі калгасаў могуць дапускаць прымусовае аграмаджаньне кароў і дробнай жывёлы ў паасобных калгасьнікаў.

Цэнтральны Камітэт растлумачвае, што практыка прымусовага аграмаджаньня ў калгасьнікаў кароў і дробнай жывёлы ня мае нічога агульнага з палітыкай партыі. Задача партыі заключаецца ў тым, каб у кожнага калгасьніка былі свая карова, дробная жывёла, птушка. Далейшае пашырэньне і разьвіцьцё калгасных фэрм павінна ісьці толькі шляхам гадаваньня фэрмамі маладняка, або пакупкі імі жывёлы.

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) прапануе ўсім партыйным, савецкім і калгасным арганізацыям:

1. Спыніць усякія спробы прымусовага аграмаджаньня кароў і дробнай жывёлы ў калгасьнікаў, а вінаватых у парушэньні дырэктывы ЦК выключыць з партыі

2. Арганізаваць дапамогу і садзейнасьць калгасьнікам, якія ня маюць каровы і дробнай жывёлы ў пакупцы і гадаваньні маладняка для асабістых патраб.

ЦК УсеКП(б)

АБ ПАБУДОВЕ ДАМОУ ДЛЯ СПЭЦЫЯЛІСТАУ

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗУ ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ УсеКП(б)

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. У дадатак да ўсіх прынятых мер і тых, што прымаюцца па разгортваньні жыльлёвага будаўніцтва ў гарадох і ахрамя разьвіцьця новага жыльлёвага будаўніцтва ў цэнтрах яновабудоўляў, для хуткага паляпшэньня жыльлёвага становішча спэцыялістаў і вучоных інжынераў і тэхнікаў, беспартыйных і партыйных, працуючых у розных прадпрыемствах, навукоўных і іншых установах Саюзу ССР пабудаваць у 2-х гадовы тэрмін, пачынаючы з вясны 1932 г., **102 дамы з агульнай колькасьцю кватэр 11.500.**

2. Пабудову гэтых дамоў правесьці ў наступных гарадох: **па 300 кватэр кожны:**

1) **у Маскве** — 10 дамоў, 2) **у Ленінградзе** — 5 дамоў, 3) **у Харкаве** — 1 дом, 4) **у Сталінградзе** — 1 дом.

Па 100 кватэр кожны:

5) **у Арцёмаўску** — 1 дом. 6) **у Баку** — 3 дамы, 7) **ва Уладывастоку** — 1 дом, 8) **у Варонежы** — 3 дамы 9) **у Днепрапятроўску** — 2 дамы, 10) **у Іванава-Вазьнясенску** — 2 дамы 11) **у Казані** — 1 дом. 12) **у Каменскім** — 1 дом, 13) **у Кіеве** — 3 дамы, 14) **у Менску** — 2 дамы, 15) **у Ніжнім-Ноўгарадзе** — 2 дамы, 16) **у Новасібірску** — 1 дом, 17) **у Адэсе** — 1 дом, 18) **у Растове-на-Дану** — 3 дамы, 19) **у Самары** — 3 дамы, 20) **у Сьвярдлоўску** — 3 дамы, 21) **у Смаленску** — 1 дом, 22) **у Сталіно** — 1 дом. 23) **у Ташкенце** — 2 дамы. 24) **у Тыфлісе** — 1 дом 25) **ва Уфе** — 1 дом, 26) **у Хабараўску** — 2 дамы, 27) **у Харкаве** — 3 дамы (адзін з іх у гэбне чыгуначнага вузла).

Па 50 кватэр кожны.

28) **у Алма-Аце** — 1 дом, 29) **у Архангельску** — 1 дом, 30) **у Бранску** — 1 дом, 31) **у Верхня-Удзінску** — 1 дом, 32) **у Віцебску** — 1 дом, 33) **у Гомелі** — 1 дом, 34) **у Горлаўцы** — 1 дом, 35) **у Грозным** — 1 дом, 36) **у Дзбальцэве** — 1 дом, 37) **у Іжэўску** — 1 дом, 38) **у Іркуцку** — 2 дамы, 39) **у Калініне** — 1 дом, 40) **у Канавіне** — 1 дом, 41) **у Кастраме** — 1 дом, 42) **у Красноярску** — 1 дом, 43) **у Луганску** — 1 дом, 44) **у Макееўцы** — 1 дом, 45) **у Махач-Кала** — 1 дом, 46) **у Малатава** — 1 дом, 47) **у Нікітаўцы** — 1 дом, 48) **у Омску** — 1 дом, 49) **у Арджанікідзэ** — 1 дом, 50) **у Пэрмі** — 1 дом, 51) **у Петразаводзку** — 1 дом, 52) **у Семіпалацінску** — 1 дом, 53) **у Сімферопалі** — 1 дом, 54) **у Сормаве** — 1 дом, 55) **у Сталінабадзе** — 1 дом, 56) **у Сыктыўкары** — 1 дом, 57) **у Таганрогу** — 1 дом, 58) **у Туле** — 2 дамы, 59) **у Фрунзэ** — 1 дом, 60) **у Чаджуі** — 1 дом, 61) **у Чэрэмхове** — 1 дом, 62) **у Чыце** — 1 дом, 63) **у Шуі** — 1 дом, 64) **у Энгельсе** — 1 дом, 65) **у Эрывані** — 1 дом, 66) **у Якуцку** — 1 дом, 67) **у Яраслаўлі** — 1 дом.

3. Кватэры ў гэтых дамох павінны быць з 3-х і 4-х пакояў (у раённай колькасьці з нарысной плошчай ў 47 і 65 кв. мэтраў) з кухняй, ванай і іншымі выгадамі ў кожнай кватэры.

4. Расходы па пабудове гэтых дамоў і спабжэньні іх цэнтралізаванымі матар'ыямі прымаць за кошт рэсурсаў Саюзу ССР.

5. Даручыць прэзыдыюму гарсаветаў, пералічаных у пункце 2-м дадзенай пастановы гарадоў, адвесьці ў тэрміновым парадку адпаведныя зямельныя вучасткі, падрыхтаваўшы іх для неадкладнай забудовы, паказанымі дамамі.

6. Даручыць Дзяржплану Саюзу ССР вызначыць з фондаў будаўнічых матар'ялаў у 1932 г. і пратуледзець у 1933 годзе неабходныя матар'ялы для пабудовы і абсталяваньня вызначаных дамоў.

7. Прапанаваць СНК саюзных рэспублік абавязаць наркаматы камунальнай гаспадаркі скласьці ў месячны тэрмін сумесна з адпаведнымі гарсаветамі кашторысы кошту матар'ялаў і рабочай сілы, прыстасоўна да мясцовых умоў і прадстаўіць іх у Дзяржплян і НКФ Саюзу ССР.

8. Даручыць НКФ Саюзу ССР у пакадны тэрмін разгледзець кашторысы пабудовы вызначаных дамоў па прадстаўленьні іх адпаведнымі ўрадамі саюзных рэспублік або гарсаветамі і прымеціць калянцарныя тэрміны фінансаваньня гэтага будаўніцтва з агульнасаюзных сродкаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) І. СТАЛІН.

25 сакавіка 1932 г.
Масква, Кремль.

Саўгас „Ялава" падрыхтаваны да сяўбы

ЧАВУСЫ. (Наш спэцкор.).

Саўгас «Ялава» 15 сакавіка дэманстраваў сваю баявую гатоўнасьць да сяўбы пробным выездам у поле. Выезд паказаў, што саўгас у аспоўным да сяўбы падрыхтаваўся. Адрамантавана 5 трактараў, падрыхтавана конская цягавая сіла. Увесь с.-г. інвэнтар, збруя і калёсы таксама адрамантаваны. Поўнасьцю адсартавана і ачышчана насеньне. Завезена 8 тон штучнага ўгнаеньня. Зараз саўгас вывозіць на поле гной з хлявоў, 50 проц. гною ўжо вывезена.

Складзен вытворча-фінансавы план саўгасу, які дэтальна абгавораны на агульным сходзе рабочых і паасобнымі брыгадамі.

Падрыхтаваўшыся да сяўбы, саўгас пакіраваў буксірныя брыгады на дапамогу падпэфным калгасам «Юны піянэр» і імя Калініна.

Скончыўшы рамонт свайго інвэнтару, дырэкцыя саўгасу аддала ў карыстаньне падпэфным калгасам сваю кузьню і рымарную майстэрню з усімі інструментамі і абсталяваньнем, дзе калгасы зараз рамонтуюць свой інвэнтар.

Посьпехі гэтыя дасягнуты толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву з боку трыкутніка і рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна.

Саўгас «Ялава» выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва на хутчэйшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы саўгас Далёкая Ніва.

УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР ПАМЯЦІ ГЁТЭ У МАСКВЕ

МАСКВА. Адбыўся арганізаваны ВОКС-ам урачысты вечар у адзнаку стагодзьдзя са дня сьмерці Гётэ.

На вечары прысутнічалі Нарком замежных спраў тав. **М.М. Літвінаў**, намесьнік Наркома замежных спраў тав. **Н. Н. Крэсьцінскі**, германскі посол **фон-Дыркс

ПРАВІЛЬНА ПАБУДАВАЦЬ ВЫТВОРЧУЮ БРЫГАДУ—

верны спосаб арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў

Супроць скажэньняў у арганізацыі калгасных брыгад

Важнейшым зьвяном у арганізацыі калгаснай працы павінна стаць пастаянная вытворчая брыгада. У мэтах усьпішнага правядзеньня гасьці працы, зьвязанасьці абязьлічкі, павышэньня ўрадлівасьці, па брыгадамі трэба замацоўваць пэўныя палявыя вучасткі, коні, сельска-гаспадарчыя машыны, інвэнтар і інш.

На сёньняшні дзень арганізацыя пастаянных брыгад праходзіць нязвычай марудна. Большасьць раённых арганізацый не пераключылася на баявыя тэмпы, ня выканала пастановы ЦК КП(б)Б аб скончэньні работ на арганізацыі брыгад да 1 красавіка. Адтуль бляваі задача кожнай партарганізацыі, кожнай парт'ячэйкі і калгасна-замольных арганізацый — удзесяцярыць тэмпы па арганізацыі пастаянных брыгад, аказаць канкрэтную дапамогу калгасам, мабілізаваўшы на гэтую справу партыйна-камсамольскі актыў.

Разам з гэтым трэба канцэнтраваць, што пры арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад не павінна быць мэханічнага падыходу да ўсіх калгасаў. У залежнасьці ад мясцовых умоў, велічыні арэалі, ня арганізаванасьці палявых вучасткі ў некаторых калгасах (а іх у БССР значная колькасьць) прыдзецца замацоўваць за брыгадамі не па ўвесь сельска-гаспадарчы сэзон, а толькі на пасобны перыяд сельска-гаспадарчых работ (ворыва, пасьба, уборка).

У дробных калгасах, дзе на полі будзе працаваць 15-20 чалавек, ня можа быць і гутаркі аб арганізацыі брыгад, як першачарговых вытворчых атрадаў калгасу. Дробны калгас сам ператворыцца вытворчай адзінкай. Тут трэба правільна арганізаваць працу, расстаўць сілы, кожнаму калгаснику сваячасова даць вытворчае заданьне, устанавіць персанальную адказнасьць за карыстаньне сродкамі вытворчасьці: канём, калёсамі, плугам, баранай. Работай павінен кіраваць і адказваць за работу сам старшыня калгасу.

У іншых калгасах неабходна стварыць жывёлагадоўчую і апу палявадчую брыгаду, якая павінна будзе апрацаваць увесь калгасны клін, пачынаючы з сяўбы і канчаючы малацьбой. У такіх выпадках пасеўная плошча не разбіваецца на вытворчыя вучасткі таму, што ўвесь пасеўны клін калгасу складае адзін вытворчы вучастак. За работу паляводчай брыгады перад праўленьнем нясе адказнасьць брыгадзір. У часе палявых работ брыгада вытрачае пасобныя групы (аратых, баравальнікаў, сейбітоў) з такой расстаноўчай сіл, каб была наладжана канкрэтная сыстэма работы.

У сярэдніх, асабліва буйных калгасах, абавязкова трэба пасеўную плошчу разбіваць на вытворчыя вучасткі. Для гэтага трэба перш-наперш правільна арганізаваць тэрыторыю, у адпаведнасьці з устаноўленым сакгасдротам правільна разбіць па вучастках культуры. Польга мэханізаваць, па-роўнай разбіваць культуры на ўсіх вытворчых вучастках. У кожным вучастку павінна быць вядучая культура з іншымі культурамі з тым, каб брыгада ў асноўным была нагружана роўнамерна работай у часе ўсяго сельска-гаспадарчага сэзону.

У кожным калгасе пры арганізацыі брыгад трэба ў першую чаргу арганізаваць тэрыторыю, вытворчыя вучасткі, склаўшы вытворчыя праграмы работ, вызначыць неабходную колькасьць машын, цягавай сілы, сельска-гаспадарчага інвэнтару для кожнага вучастку і толькі пасьля гэтага трэба пераходзіць да арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад, разьбіваць пры актыўным удзеле ўсёй масы калгаснікаў па брыгадах, замацоўваць за брыгадамі вучасткі і сродкі вытворчасьці.

У сувязі з гэтым у некаторых калгасах дапускаюцца самыя грубыя скажэньні асноўных прынцыпаў пабудаваньня вытворчых брыгад. Замест вытворчых брыгад у сапраўднасьці атрымліваюцца брыгады-дворкі, вылучаецца па два брыгадзіры ў брыгадзе і інш. Работнікі некаторых калгасаў, райкалгасаўцы, якія пад шыльдай фармальнай арганізацыі вытворчых брыгад прапануюць брыгады-дворкі, павінны атрымаць рашучы адпор з боку партыйных арганізацый.

Брыгада Лагінава—адна з лепшых

ДНЕПРОЎ. (БелТА). Прапрацаваўшы дырэктыву ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага, калгас «Завет Ільліча», Александрыйскага сельсавету, у асноўу арганізацыі калгаснай працы паклаў вытворчую брыгаду. Уся пасеўная плошча разбіта на вытворчыя вучасткі. Арганізаваны 4 пастаянныя брыгады. За брыгадамі замацавана рабочая жывёла, інвэнтар, машыны і адпаведныя палявыя вучасткі.

Лепшыя ўзоры ў рабоце паказала брыгада № 2, якой кіруе т. **Лагінаў.** У брыгадзе 11 працаздольных калгаснікаў. За гэтай брыгадай замацавана 13 коняй, 11 плугоў, адна жнярка, калатарня, 10 калёс і г. д.

Кожны член брыгады ведае свае месца, дзе і што яму трэба рабіць. Так, за падрыхтоўку зброї адказвалі **Міцкевіч і Красоў,** адзін з іх віў вяроўкі, другі, лейцы, другі — рамантаваў зброю.

Працавалі зьдзельна.

За рамонт с.-г. інвэнтару і машын адказваў **Сідараў.** Коняй даглядаў **Ярмакоў.** Корм скарыстоўваецца рацыянальна і строга па нормах. Ермакоў корміць прымацаваных коняй па наступнай норме: 15 фунт. сена, адзін чацьверык сечкі (12 фунт. сечкі і 4 фунт. аўса). Такую норму каню даюць два разы ў дзень — уранньі і ўвечары.

Для ачысткі пасеньня былі вылучаны два члены брыгады. За ачыстку ў дзень 200 пуд. пшаніцы, або ячменю залічваўся адзін працадзень, за 130 п. аўса таксама працадзень. Машыны працавалі ў тры зьмены. **За 10 дзён ачышчана 970 пуд. аўса, 386 п. ячменю і 180 пуд. ільнанасеньня.**

Аплата працы самога брыгадзіра будзе залежыць ад колькасьці і якасьці работы ўсёй брыгады.

План пасеву і нормы выпрацоўкі даводзены да кожнага члена брыгады. Брыгада адказвае за сваячасовы пасеў яравога кліну, сваячасовую ўборку і малацьбу ўраджаю.

Брыгада тав. Лагінава поўнасьцю падрыхтавана да выхаду ў поле.

Павысіць тэмпы падрыхтоўкі

Партарганізацыя Камарынскага раёну ліквідавала вялікарагальнымі тэмпамі разгортвае падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

З 36-ці калгасаў рабу толькі ў 9 закончана складаньне гадавых вытворчых плянаў і арганізаваны вытворчыя брыгады. Райкалгасаюз вельмі мала практычна дапамагае ў гэтай справе калгасам.

Калі ў некаторых калгасах, дзе партыйныя арганізацыі па - баявому ўключыліся ў правядзеньне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы калгасыкі на аснове сустрэчнага плянаваньня, значна павялічылі пляны засеву яравых культур («Чырвоная Украіна», «Дзень калектывізацыі», «Інтэрнацыянал»), дык у радзе іншых калгасаў мае месца зьмяншэньне плянаў. Так, у калгасе імя Сталіна пасеўны план зьменшаны на 54 га, у калгасе «Адказ інтэрвэнтам» — на 6½ га.

Марудна праходзіць ссыпка насенных фондаў, асабліва тэхнічных культур і бульбы. Ішчэ горш па адпаведным сэктары, дзе процант ссыпкі насенных фондаў хістаецца ад 10 да 25. На лепш стаіць справа з ачысткай насеньня. Рамонт сельска - гаспадарчых машын і інвэнтару як па калгасным, так і па адпаведным сэктарох праведзен на 70-75 проц.

Зусім мала аддаецца ўвагі падрыхтоўцы кадраў. Паводле пляну Калгасцэнтру ў раёне павінна быць праведзена праз розныя курсы масавых кваліфікацый звыш 600 асоб. На сёньняшні дзень курсамі ахоплена толькі 61 чал.

Невыстарчальна разгорнута масавая работа. У радзе калгасаў («Інтэрнацыянал» і інш.) да гэтага часу не распрацавана пастанова ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

П-ка.

„Чырвоны артылерыст" дапамагае адстаючым калгасам

Апэрацыйнае і канкрэтнае кіраўніцтва кожным нізавым зьвяном вытворчасьці, правільная расстаноўка партыйных сіл, змаганьне за поўную рэалізацыю 6 умоў т. Сталіна характарызуе сабой работу партыйнай ячэйкі калгас «Чырвоны артылерыст» (Полацкі раён).

У рэзультаце такой пастаноўкі работы ў калгасе па ўсіх відах загатовак перавыкананы плянавыя заданьні. У першым квартале бягучага году план мясазагатовак перавыкананы на 9 проц.

Зараз партыйная ячэйка і праўленьне калгасу па-бальшавіцку рыхтуюцца ад веснавой сяўбы. Вытворчы план абгаворан на партыйным, камсамольскім і калгасным сходах. Закончана ссыпка насеннага страхавога і фуражнага фондаў, закончан рамонт інвэнтару і зброї.

«Чырвоны артылерыст» узяў на грамадзкі буксір адстаючы калгас «Савецкая Беларусь», арганізавалі дапамогу некалькім калгасам па рамонце інвэнтару.

Мірончык, Фальковіч.

Брыгады-дворкі замест вытворчых

КОЙДАНАВА. (Наш спэцкор.).

Брыгада № 1 калгасу «Ленінскі шлях», Мажаўчыцкага сельсавету, мае такі структурны твар: мужчыны—26, жанчын — 29.

Брыгадзір мужчынскай часткі брыгады — **Калечыц Мікола,** жанчын — **Казановіч Палагея.** Праўленьне лічыць, што жанчыны, мусіць, увесь час будуць працаваць асобна ад мужчын.

Заданьне на пасеве: 267,5 гэкт. плюс 43 гэкт. пасеўнай канюшыны.

Як-жа брыгада змагаецца за навышэньне ўраджайнасьці?

Весь план праўленьня калгасу. Тэрміны сяўбы: ранніх культур — з 15 красавіка па 5 чэрвеня, позьніх культур — з 6 па 30 чэрвеня. Тэрміны сяўбы «ушчыльнены» да... **75** дзён. Гэта ня казка, а сапраўднасьць.

Тэрміны ўборкі: уборка сенажаці з 1 ліпеня па 14 жніўня, — 44 дні, уборка азімых — з 15 жніўня па 25 верасьня — 40 дзён, уборка яравых —з 26 верасьня па 6 лістапада—40 дзён.

«Ідэальная» паступовасьць захавана з вялікай «геніяльнасьцю». Работа проста буйсьць плысьць сама ў парадку ўстаноўленай чаргі.

Возьмем ягто і такі падзвычай «улады» прыклад, як размеркаваньне культур па брыгадах. Кожнай брыгадзе далі належную ёй частку тэй ці іншай культуры. Кожная брыгада, напрыклад, атрымала па адным гэктары канапель. Ну, якія пасьля гэтага могуць быць параканьні? Ясна, ніякіх, бо ўсё ў парадку. Арганізатары нікога не пакрыўдзілі, даўшы кожнай брыгадзе роўныя вучасткі.

Арытметыка праўленьня надзвычай простая. Есьць у вас 500 гэкт. пасеўнай плошчы, а людзей у калгасе — 100. Падзяляеце 500 на 100 — будзе 5. Ведаючы колькі ў якім пасоўнічы душ, вы памнажаеце 5 на гэты лік і вось у вас ёсьць плошча для брыгады—створан так званы «вытворчы» вучастак.

***

— Тав. рахункавод, гэта ў вас часам не памылка наконт тэрмінаў?

— Не, гэта не памылка, яно так і павінна быць.

— Выбачайце, урадавы тэрмін—максымум 24 дні.

— Мы ня можам справіцца за 24 дні, коні ня вырвуць, — перэрва выпаліў свае стандартныя словы рахункавод.

— А вы як вылічылі тэрміны сяўбы?

— Вельмі проста. Селі, абгазарылі і запісалі. Як-жа інакш можа быць?

— Нормы выпрацоўкі ў вась ёсьць?

— Ёсьць каваг дзьве — летапіня і сёлетняя, але мы іх ніяко не зацьвердзілі.

Стала ясным, адкуль прыпоў гэты «плян». Брыгады складзены па аснове «уможаньня» праўленцаў.

Добра праверыўшы, сталі ў прыгожую шарэнгу наступныя **РЭАЛЬНЫЯ** лічбы. Для паляводзтва калгасу на плошчы 900 гэкт. патрэбна 100 чалавек рабочай сілы, 104 коні. **ПЛЯН СЯЎБЫ МОЖНА ВЫКАНАЦЬ ЗА 24 ДНІ.** Лішак рабочай сілы — 14 чалавек. Коняй хапае, нават будзе лішак, калі прыпадь пад увагу, што калгасу будзе дапамагаць МТС.

Убачыўшы новыя, зусім рэальныя лічбы, у старшыні калгасу **Кулько** яркім праменьнем бліснула недавер'е.

Як ня крушіліся праўленцы, а прыйшлося згадзіцца з тым, што яны **дапусьцілі самае грубае скажэньне асноўных прынцыпаў у справе арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад.**

У калгасе «Ленінскі шлях» брыгады будаваліся вытворчыя, а сапраўды атрымаліся брыгады-дворкі таму, што ніякіх паказальнікаў, неабходных для вытворчай брыгады, тут ня знойдзеш. Тэрміны сяўбы ня вытрымліваюць ніякай крытыкі, бо яны зрываюць уздым ураджайнасьці ў калгасе. Увязка і пасьлядоўнасьць работ зроблены мэханічна, без усякага разьліку і абгрунтаваньня. Пры размеркаваньні культур на брыгадах (вытворчыя заданьні па пасеве) дапушчана непатрэбная ўраўнілаўка. Няма норм выпрацоўкі, г. зн. няма арганізуючага прынцыпу для вытворчай брыгады. Зусім непатрэбна і нават шкодна ўстанаўляць разьмежаваньне брыгад па родзе і вызначаць двох брыгадзіраў для мужчын і жанчын.

Праўленьне калгасу «Ленінскі шлях» павінна ў самым тэрміновым парадку карэнным чынам **перагледзіць** план арганізацыі вытворчых брыгад, **ВЫПРАВІЎШЫ** дапушчаныя скажэньні.

П. ЧЫКУН.

„Брыгадзіры вызначаны, адзін з мужчын, а другі—з жанчын"

ЛЕЗНА. (Наш спэцкар.).

Арганізацыя вытворчых брыгад на раёне праходзіць надзвычай марудна. На 20 сакавіка брыгады складзены толькі ў 2-3 калгасах. Аднак, старшыня райкалгассаюзу т. **Цараў** і дырэктар МТС т. **Сэлізакаў** мяркуюць гэтую работу скончыць да 1 красавіка.

Муркуюць... А ў выніку слабага кіраўніцтва райкалгассаюзу і МТС на мясцох дапускаецца рад грубых скажэньняў пры арганізацыі пастаянных брыгад.

Так, калгас імя **Варашылава** арганізаваў 4 брыгады не на вытворчай, а на тэрытарыяльнай аднавы. Старшыня гэтага калгасу т. **Сахараў** з гонарам на савеце МТС дакладае: «Брыгады складзены, брыгадзіры вызначаны, адзін з мужчын, а другі — з жанчын».

Яшчэ горш у калгасе **«Шлях бальшавіка»,** Добрамысьлінскага сельсавету. Тут склалі брыгады, але не замацавалі за імі пэўных вучасткаў зямлі. Праўленьне ўзяло курс на абязьлічваньне палёў.

У калгасе **«Бязбожнік»** таксама арганізавалі брыгады, нават пры непасрэдным удзеле працаўніка Калгасцэнтру т. **Казакевіча.** Але, як ня дзіўна, забылі «дробязь» — не распрацавалі нормы выпрацоўкі. Зразумела, што бяз норм выпрацоўкі нельга распрацаваць вытворчае заданьне для брыгады.

Райкалгассаюз і МТС павінны зараз-жа выправіць дапушчаныя памылкі, узмацніць штодзённае **апэрацыйнае** кіраўніцтва ўсёй работай па арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад.

А. МІКУЦКІ.

ШЫРЭЙ ВЫКАРЫСТАЦЬ ВОПЫТ ДРЫСЫ

Разгарнуць барацьбу за поўную ліквідацыю запазычанасьці дзяржаве

ДРЫСА.

Адозва раённых арганізацый і перадавых калгасаў аб арганізацыі ўсебеларускага чырвонага ільнянога абозу знайшла жывы водгук сярод калгасных і адпаведных бядняцка-сераднацкіх мас раёну.

Раённы плян па калгасным і однаасобным сэктарох выкананы на 95 проц.

Некаторыя калгасы і вёскі адказалі на адозву чырвонымі абозамі з ільном. Калгас «Камінтэрн» здаў 475 клгр. валакна, «Ленінскі шлях»—797 клгр., камуна «Маяк» — 840 клгр., калгас «Барацьбіт» — 107 клгр., імя Калініна — 195 клгр., «Чырвоны выбаржэц» — паўтоны трасты, камуна «Сталіна» — 4 тоны ільну-сырцу

Апрача таго, у парадку самаабавязацельствазу, камуна імя Сталіна здала тры тоны ільну-сырцу і 250 клгр. валакна, калгас «Вучань Леніна» — 2 цэнт. ільну, «Свабода» — 2 цэнт. валакна-сырцу, «Чырвоная горка» — 100 клгр. валакна і г. д.

Недастаючыя і однаасобныя бядняцка-сераднацкія гаспадаркі раду вёсак. Так, однаасобнікамі Жоўтінскага, Карнавецкага, Сор'янскага, Вялынецкага сельсаветаў за апошнія дні здана капя 2.000 клгр. ільнавалакна.

Але тое, што на 15 сакавіка запазычанасьць раёну дзяржаве складае 318,7 тоны, патрабуе ад усіх партыйных, савецкіх і калгасных арганізацый ня спыняцца на дасягнутым, а максымальным узмацненьнем тэмпаў перэапрацоўкі, разгортваньнем масавой работы дабіцца бездакладнага завяршэньня ільназагатовак.

З. Р.

Толькі 48 калгасаў выканалі плян

ГАРАДОК

Плян ільназагатовак на Гарадоцкім раёне выкананы на 36,48 проц. Калгасы здалі 47,33 проц. пляну, однаасобнікі — 24,2 проц., па цьвёрдых заданьнях спагнана 13,57 проц.

Толькі 48 калгасаў прышлі з поўнай перамогай у выкананьні плянаў. Сярод іх калгасы «Перамога», «Чырвоны пралетары», імя Молатава, імя Будзёнага, «1 Мая», «Актывіст», «Кастрычнік», «Усход», «Чырвоны маяк», «Крыльлі Саветаў», «Чырвоная горка», «Новы сьвет», імя Карла Маркса і г. д.

У той-жа час ёсьць значная частка калгасаў, якая ня выкапала сваіх абавязкаў перад дзяржавай. У некаторых калгасах лён да гэтага часу не апрацаваны.

Па-ранейшаму адстае однаасобны сэктор. Тлумачыцца гэта тым, што пасобныя раённыя арганізацыі і сельсветы недаацэньваюць значэньня однаасобніка ў ільназагатоўках. Між тым удзельная вага однаасобнага сэктару ў раённым пляне ільназагатовак складае 33,65 проц.

У Боркаўскім і Александраўскім сельсаветах кулацка-заможныя гаспадаркі не здалі ні аднаго кілёграму ільнавалакна. Ухіляючыся і зрываючы ільназагатоўкі, кулак вядзе шалёную агітацыю сярод адсталай часткі калгаснікаў і однаасобнікаў беднякоў і сераднякоў за разбазарваньне ільну.

Месячнік завяршэньня ільназагатоўчай кампаніі павінен прынесьці поўную перамогу ў барацьбе за лён. Трэба неадкладна арганізаваць буксірную дапамогу адстаючым калгасам, узмацніць тэмпы перапрацоўкі валакна. Трэба абвясьціць рашучую барацьбу кулацка-рвацкім тэндэнцыям.

К. П.

Перадавікі ільназагатовак

МСЬЦІСЛАЎЛЬ.

СТАРАСЕЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ ВЫКАНАЎ ПЛЯН ІЛЬНАЗАГАТОВАК НА 112,2 ПРОЦ., ЯНАЎСКІ—НА 102,1 ПРОЦ. НЕКАЛЬКІ АДСТАЮЧЫЯ ПЯЧКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ЯКІ ЗДАЎ УЖО 78,7 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

АДСТАЮЧЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ І КАЛГАСЫ ПАВІННЫ ЗЯЦЬ ПРЫКЛАД АД ГЭТЫХ ПЕРАДАВІКОЎ ІЛЬНАЗАГАТОВАК.

С. КАРМЯНІКАЎ.

Кулацка-заможныя гаспадаркі недадал дзяржаве сотні цэнт. валакна

КРУПКІ. (БЕЛТА). Крупскі раён павінен здаць 920 тон ільнавалакна. На 20 сакавіка загатоўлена 354 тоны, што складае 38,4 проц. Апошняя дэкада не дала амаль ніякага эруху ў ходзе ільназагатовак — 0,2 проц. пляну.

Нездавальняюча выконвае свае абавязкі перад дзяржавай калгасны сэктар, які здаў толькі 62 проц. пляну.

Недапушчальна адстае однаасобны сэктар, які здаў 23,8 проц. **Кулацка-заможныя гаспадаркі недадалі дзяржаве 485 цэнт. валакна, што складае значны проц. пляну.**

Ня гледзячы на ганебныя паказальнікі ў выкананьні пляну, загатоўкі ільну па раёне за апошнія дні амаль спынілася. Райільназагатканторы і ільзагатоўчыя пункты, а таксама некаторыя сельсаветы і парт'ячэйкі закінулі гэты важнейшы вучастак работы.

Толькі пасобныя сельсаветы, як Бобрскі і Выдрыцкі паказалі сапраўдныя ўзоры барацьбы за лён і выканалі свае пляны ад 130 проц. да 135 проц.

В. ЗАЛАТУХІН

На грэбні ўздыму культурнай рэвалюцыі

КП(б)Б, мабілізуючы найшырэйшыя масы рабочай клясы і калгаснага сялянства на выкананьне і перавыкананьне плянаў апошняга году чэрвёртай пяцігодкі, падыходзіць да другой пяцігодкі, асноўнай палітычнай задачай якой зьяўляецца «канчатковая ліквідацыя капіталістычных элементаў і клясаў наогул, поўнае зьніжэньне прычын, што парадзяюць клясавы розьніцы і эксплёатацыю і перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва» (з рэзалюцыі XVII партыйнай канфэрэнцыі).

У гэтай абстаноўцы і ў сьвятле задач пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва асабліва важнае палітычнае значэньне набывае поўнае завяршэньне барацьбы за ўсеагульную пісьменнасьць. **«Без пагалоўнай пісьменнасьці, без выстарчальнай ступені гаўкоўвасьці, без выстарчальнай ступені прывучэньня насельніцтва да таго, каб карыстацца кніжкамі, і без матар'яльнай асновы нам сваёй мэты не дасягнуць» (Ленін,** «Аб кааперацыі»). І далей: «Для нас даволі цяпер гэтай культурнай рэвалюцыі для таго, каб аказацца цалкам сацыялістычнай краінай» (Ленін, там-жа).

Агульнае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, гігантскі рост «матар'яльнай асновы» (Ленін) далі рашаючыя посьпехі і на вучастку культурнай рэвалюцыі, гэтай неадрыўнай часткі агульнага фронту клясавай барацьбы.

КП(б)Б, выконваючы пастановы XVI зьезду УсеКП(б), які падкрэсьліў, што правядзеньне ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучаньня і ліквідацыя пісьменнасьці павінна стаць «баявой задачай партыі ў бліжэйшы перыяд», — знаходзіцца ўжо **напярэдадні завяршэньня** барацьбы за пагалоўную пісьменнасьць усяго насельніцтва БССР.

Увядзеньне (у 1929-30 г.) усеагульнага абавязковага навучаньня дзяцей школьнага ўзросту, якое зьяўляецца вялізарнай перамогай пралетарыяту, дазволіла ахапіць усімі працоўнымі школамі БССР 98,3 проц. дзяцей 8-11 гадовага ўзросту.

Даншкольнымі ўстановамі ахоплена 74.500 дзяцей, супроць 49.600 у 1930 г. За параўнальна невялікі тэрмін мы здолелі ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 800.000 чалавек працоўнага насельніцтва. Гэта новая армія, навучаная грамаце і далучаная да культуры, зьяўляецца актыўнай сілай у сацыялістычным будаўніцтве. Такім чынам, агульная пісьменнасьць БССР паднята да 80 проц. усяго насельніцтва, супроць 32 проц. у 1920 годзе і 16 проц. да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Толькі ў рэзультаце Кастрычніцкай рэвалюцыі працоўныя масы Беларусі атрымалі поўную магчымасьць будаваць, ствараць сваю культуру,—нацыянальную па форме і пралетарскую па зьмесьце.

Кіруючыся пастановай ЦК «Аб пачатковай і сярэдняй школе», якая выцякае з указаньняў тав. Леніна, зробленых ім у заўвагах на тэзісы Н. К. Крупскай,—мы маем значныя дасягненьні і на фронце барацьбы за політэхнічную школу.

Пры школах абсталявана каля 800 рабочых пакояў і 425 майстэрань. Праведзена масавае прымацаваньне пачатковых і павышаных школ да прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў і МТС, на аснове заключаных паміж імі дагавораў на ўзаемную дапамогу. Гэта прымацаваньне ахапіла больш 70 проц. усёй школьнай сеткі.

Адначас, з усёй сілай трэба падкрэсьліць, што **на гэтым вучастку культурнага фронту намі зроблена чацьвертая частка таго, што патрэбна было-б зрабіць.** Тэхнічная рэканструкцыя школы, ход абсталяваньня рабочых пакояў і майстэрань, не пачаталаны яшчэ цэнтралізаванаму пляну, **мала ініцыятывы органаў народнай асьветы** і зусім невыстарчальная ўвага з боку мясцовых партыйных, савецкіх, гаспадарчых і іншых арганізацый да важнейшага пытаньня барацьбы за ленінскую політэхнічную школу.

Патрэбна, каб адпаведныя наркаматы, арганізацыі і органы Наркамасьветы прынялі тэрміновыя канкрэтна-апэрацыйныя меры да абсталяваньня рабочых пакояў і майстэрань у кожнай школе. Узмацніць адказнасьць у сувязі з гэтым парт'ячэек і сельсветаў за перабудову савецкай школы. Вельмі часта ў нас дапускаюцца грубейшыя скажэньні політычнай партыі ў практыцы правядзеньня політэхнізацыі школы. Замест сапраўднай вытворчай асьветы вучняў, — тэарытычнае розважаньне аб вобразах (Мазыр і інш.), замест «навучаньня асновам сучаснай індустрыі наогул» (Ленін) — скарыстаньне вучняў на чорных работах аж да капаньня бульбы і г. д.

Імкненьне правых апартуністаў утрымаць у сьцёнах савецкай школы традыцыі старой буржуазна-славеснай схаластычнай школы, і «левых» пражэкцёраў, якія адмаўляюць «шырокую агульную» (Ленін) адукацыю яшчэ праяўляюць сябе ў галіне будаўніцтва політэхнічнай школы.

Зусім відавочна, што «ўсякая спроба аладзець політэхнізацыю школы ад сыстэматычнага і моцнага ўваеньня навук, асабліва фізыкі, хэміі і матэматыкі», таксама і падмена сапраўднай політэхнізацыі славеснымі аб ёй разважаньнямі «прадстаўляе сабой грубейшае скажэньне ідэі політэхнічнай школы (з пастановы ЦК аб школе).

Агульнакультурны ўзровень краіны вымяраецца ня толькі па агульнай пісьменнасьці насельніцтва і па ахопу дзяцей школамі, але і па ступені разгортваньня **вышэйшай народнай асьветы.** Рабочая кляса і калгаснае сялянства БССР пад кіраўніцтвам нашай партыі дабіліся сапраўды вялікіх перамог і на гэтым вучастку барацьбы за высокакваліфікаваныя кадры, за пралетарскую нацыянальную інтэлігенцыю. Сетка ВНУ узрасла з 12 у 1930-31 годзе да 26 у 1931-32 г. з колькасьцю студэнтаў у 6.000 чалавек; колькасьць тэхнікумаў за тойжа час узрасла з 36 да 65, з колькасьцю студэнтаў 11.559 чалавек. Лік рабфакаў павялічыўся з 11 у 1930 г. да 24 у 1931 г.

Культурны рост БССР можа быць праілюстраваны шырокім разгортваньнем навукова-дасьледчай работы. Беларуская акадэмія навук, якая яднае 13 навукова-дасьледчых інстытутаў і рад нацыянальных сэктароў, была цытадэлі контрэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, зараз ачышчаная ад іх, паноўнена новымі і партыйнымі сіламі, стала на шлях ператварэньня ў сапраўдны цэнтр марксыцка-ленінскай навуковай мысьлі.

Праз інстытут асьпірантуры БАН рыхтуецца больш двухсот маладых навуковых спэцыялістаў. Трэба адзначыць, што вядомая пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб ліквідацыі адставаньня тэарытычнай работы ад актуальных задач сацыялістычнага будаўніцтва Беларускай Акадэміі Навук яшчэ ня выканана. Барацьба за марыса - ленінскую партыйнасьць у навуцы, барацьба за актуалізацыю тэматыкі, якасьць прадукцыі і эфэктыўнасьць у рабоце — такава бліжэйшая задача Акадэміі Навук.

Шпаркі рост гаспадаркі і культуры БССР, правільнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай — забясьпечылі вялізарны разьвіх выдавецкай дзейнасьці. Аднак, Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі яшчэ нездавальняюча перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі. Якасьць кнігі застаецца нізкай. На працягу 1931 г. былі выданы некаторыя палітычна шкодныя кнігі, дзе працягваецца трацкісская кантрабанда і фальсыфікуецца гісторыя партыі (Валасевіч — «Самая кароткая гісторыя УсеКП(б)» і рад інш.).

Буйнейшым палітычным прабелам у рабоце Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі зьяўляецца зусім слабая работа па выданьні твораў Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна, а таксама і работ па барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам. Як асабліва недапушчальнае зьявішча неабходна адзначыць, што да гэтага часу ня выдан 12-томнік твораў Леніна (вышлі тры тамы). Адстае выданьне літаратуры на мовах нацыянальных меншасьцяй і ня зусім здавальняючым зьяўляецца адбор перакладнай літаратуры. Адстае паліграфічная база БССР, якая патрабуе карэннай рэканструкцыі.

Чарговымі задачамі ў дзейнасьці Дзяржаўнага Выдавецтва БССР паўнна зьяўляцца: рашуча, карэнная перабудова на аснове пастаноў ЦК УсеКП(б) аб рабоце Дзяржвыдавецтва. Стварэньне выразна па-бальшавіцку працуючага апарату з людзей рабочай клясы і адданай справе гэтай клясы савецкай інтэлігенцыі. 6 умоў тав. Сталіна павінны быць сапраўды пакладзены ў аснову работы кожнага супрацоўніка і ад яго да ўсяго апарату ў цэлым. Толькі максымальная **выразнасьць у рабоце, УМЕНЬНЕ** праводзіць на канкрэтнай справе генэральную лінію партыі можа забясьпечыць нам патрэбныя тэмпы работы ў новай абстаноўцы культурнай рэвалюцыі.

«Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай. Пара бальшавікам самім стаць спэцыялістамі. Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі рашае усё». (Сталін).

Гэта канкрэтная дырэктыва правадыра нашай партыі і зусім выразныя ўказаньні XVII партканфэрэнцыі павінны знайсьці найбольш выразнае адлюстраваньне ў рабоце ўсёй КП(б)Б і кожнай арганізацыі.

Па гэтым вучастку работы мы пакуль што абмяжоўваемся толькі разгортваньнем сеткі тэхнічных гурткоў тады як пытаньне барацьбы за тэхніку трэба разумець значна шырэй, г. зн. так, як яно пастаўлена ў вядомай пастанове ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б.

Змагаючыся з ухілам да вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі на даным тапе, мы не павінны ні на мінуту аслабляць барацьбы з ухіламі да мясцовага шавінізму, **«адкуль з форм праўленьняў ухілу ў бок мясцовага шавінізму** — гаворыцца ў пастанове бюро ЦК і ЦКК КП(б)Б, — **зьяўляецца падыход да нацыянальных кадраў без уліку ідэалёгічнай вытрыманасьці і сацыяльнага складу гэтых кадраў, забываючы і прыпускаючы тое, што адзіным крытэрыям для ацэнкі камуніста зьяўляецца ступень яго партыйнай вытрыманасьці і здольнасьці на справе аканцыцяўляць генэральную лінію партыі».**

Ліст тав. Сталіна абавязвае ўсіх партыйцаў, асабліва партактыў да больш глыбокага вывучэньня Леніна, да большай пільнасьці на тэарытычным фронце.

Пацыянал - дэмакратызм у рэзультаце пасьлядоўнай барацьбы КП(б)Б пацярпеў жорсткае паражэньне, але яшчэ поўнасьцю ня зьліквідаваны асабліва на фронце культурнага будаўніцтва, дзе контр - рэвалюцыйныя пацдэмы ў мінулым асабліва моцна зьвілі сабе гняздо, бяручы курс на адрыў БССР ад Савецкага Саюзу і яе далучэньня да фашысцкай Польшчы. Выкарчоўваньне пацдэмаўскіх карэньняў і ўсёй спалчыны пакінутай імі зьяўляецца партыйным абавязкам ня толькі работнікаў культурнага фронту, але і ўсёй партыі і рабочай клясы.

Тэмпы культурнага разьвіцьця ўсё яшчэ значна адстаюць ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. XIV зьезд і XVII партканфэрэнцыя, якая паставіла задачу ліквідацыі капіталізму ня толькі ў эканоміцы, але і ў сьвядомасьці людзей, ставіць перад культурным фронтам ня толькі ліквідацыю адставаньня, але і значнага, яшчэ большага ўзмацненьня тэмпаў культурнага разьвіцьця.

Трэба рашуча згуртаваць і канцэнтраваць усе сілы і сродкі на вузлавых пытаньнях культурнай рэвалюцыі. Да гэтых вузлавых пытаньняў могуць быць адносены: хутчэйшая ліквідацыя адставаньня навукі, культуры і мастацтва ад канкрэтных задач 4-га заключнага году пяцігодкі. **Усе сродкі дасягненьні культурнай рэвалюцыі — на фронт барацьбы за прамфінплян, за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — такава задача.** Гістарычная пастанова ЦК партыі аб пачатковай і сярэдняй школе абавязвае органы народнай асьветы, таксама, як і усе нашы партарганізацыі—па-бальшавіцку змагацца за ўсеагульнае навучаньне, за ліквідацыю пісьменнасьці, за політэхнічную школу за якасьць **камуністычнага выхаваньня ў школах,** за пастаўніцкія кадры, пільна ахоўваючы іх прававое становішча ў адпаведнасьці з пастановай ЦК аб пільне, жорстка караючы канкрэтных вінаватых, якія зрываюць гэту пастанову — такавы асноўныя зьвены агульнага ланцугу культурнай рэвалюцыі.

Барацьба за якасьць вучобы патрабуе ад усяго савецкага настаўніцтва максымальнага павышэньня ўзроўню марксыцка - ленінскіх ведаў. Аўладаць мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, аўладаць тэхнікай педагагічнага працэсу ва ўсім яго шматгранным і складным аб'ёме—павінны кожны настаўнік і ўся армія асьветчыкаў. Завочнае навучаньне — асноўная форма ў вырашэньні гэтай задачы.

Выходзячы з агульнапартыйнай устаноўкі аб тым, каб да 1 мая 1932 г. ператварыць БССР у рэспубліку су

Рамонт мэханізмаў і вярбоўку рабочых-тарфянікаў — на ўдарныя тэмпы!

АСІНТОРФ ПАВОЛЬНА РАМАНТУЕ ТОРФАМАШЫНЫ

Здабыць 680 тысяч тон торфу — баявая праграма прамкаапэрацыі

Здабыць 680 тыс. тон торфу — вялікая задача, якая стаіць перад прамысловай камбінацыяй БССР. Той факт, што ў мінулым годзе плян здабычы торфу сыстэмай Белпрамсаюзу быў выкананы толькі на 8% у значнай меры тлумачыцца слабай і несвячасовай падрыхтоўкай да торфасэзону райпрамсаюзаў па месцах. Асобная дрэнна была пастаўлена арганізацыя працы рабочых тарфянікаў у прамысловых казарменных арцелях. Усім гэм ўжываўся брыгадны метад работы, адсутнічала выхаваўчая работа, панавалі абязлічка і ўраўнілаўка. Ня былі разгорнуты сацнаборніцтва і ўдарніцтва.

Для таго, каб упікнуць недахопаў мінулага году трэба заняцца падрыхтаваннем да пачатку кампаніі торфаразпрацовак. Адтак становішча, якое мы маем на сёняшні дзень, сьведчыць аб тым, што райпрамсаюзы на месцы і ў гэтым годзе ігнаруюць усёй важнасьці свячасовай падрыхтоўкі да торфасэзону. Узяць хапя-б такое пытаньне, як падрыхтоўка балот. Работы па асушы каналаў праведзены на 35,6 проц., раскарчоўка і плітоўка балот — на 48,8 проц.

Нездавальняючымі тэмпамі праходзіць вывазка торфу: вывезена ня больш 70 проц. Між тым невыкананьне плянаў вывазкі торфу ў значнай меры перашкаджае свячасовай падрыхтоўцы балот.

Вельмі дрэнна наладжана вярбоўка рабочай сілы. Райпрамсаюзы і праўленьні арцеляй слаба ўжываюць мэтады арганізаванай вярбоўкі. Дагаворы з калгасамі не заключаюцца.

Усё гэта патрабуе ад Белпрамсаюзу і яго органаў на месцах неадкладнага пералому ў падрыхтоўцы да торфасэзону. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на палепшэньне якасьці здабываного торфу, якая (якасьць) у мінулым годзе была вельмі дрэнная; па паасобных саўгасах вільготнасьць торфу даходзіла да 75 проц. **Сорын.**

Завод імя Варашылава зацягвае выраб запасных частак

Мэханізаваная здабыча торфу на ЗАВОДЗЕ АСІНТОРФ павінна ў гэтым годзе заняць асноўнае месца. Усяго будзе прадазвана 15 торфафрэзовачных машын.

Хоця завод машынамі забясьпечан поўнасьцю, але большая частка з іх патрабуе капітальнага рамонту. Як-жа стаіць справа з рамонтам на сёняшні дзень? Вельмі дрэнна. Ні адна машына поўнасьцю ня ўсё не адрамантавана. Адсутнасьць запасных частак — галоўная прычына зацяжкі рамонту. Заказ на запасныя часткі, які быў даны заводу імя Варашылава яшчэ ў сынежні мінулага году, дагэтуль ня выкананы. Ня гледзячы на неаднаразовыя напамінкі аб хутчэйшым выкананьні заказаў, кіраўніцтва заводу імя Варашылава нівіхіх захадаў у гэтым напрамку ня прымае.

Ня прысланы запасныя часткі да 6 машын, атрыманых яшчэ ў мінулым годзе па нарадзе Саюзторфу.

ШЧАРБАК.

У баявой гатоўнасьці

РОЧЫЦА. (НАШ КАР.). НОВАЕ КІРАЎНІЦТВА ТОРФЗАВОДУ «ЗАКРАШЫНСКІ МОХ» ПА-БАЛЬШЭВІЦКУ РАЗГАРНУЛА НАДРЫХТОЎКУ ДА ТОРФ. СЭЗОНУ. ПОЎНАСЬЦЮ СКОНЧАНА ВЫВАЗКА ТОРФУ З БАЛОТ. ДОБРА ПРАХОДЗІЦЬ ВЯРБОЎКА РАБОЧАЙ СІЛЫ. УСЕ ЗАВЕРБАВАНЫЯ ЗАРАЗ-ЖА АРГАНІЗОЎВАЮЦЦА Ў БРЫГАДЫ, ДА ЯКІХ ДАВОДЗІЦЦА ПЛЯН ІХ РАБОТЫ НА СЭЗОН, З УКАЗАНЬНЕМ НОРМ І РАСЦЭНАК.

ФАРСАВАНЫМІ ТЭМПАМІ ІДЗЕ РАМОНТ МАШЫН І РЭЗНЫХ ТЭХНІЧНЫХ ПРЫЛАД. МЭХАНІЧНЫ ЦЭХ АВВЯСЦЮ СЯБЕ ЎДАРНЫМ І ЎЗЯЎ САМААБЯВЯЗАЦЕЛЬСТВА — СКОНЧЫЦЬ УВЕСЬ РАМОНТ І УСТАНОЎКУ МАШЫН НЕ ПАЗЬНЕЙ 15 КРАСАВІ.

Выкананьне павялічанага пляну не забясьпечана

УБАРАВІЧЫ.

У бяручым годзе торфазавод «Бальшавік» павінен здабыць 138 тысяч тон торфу. Праграма мінулага году павялічана на 460 проц. Гэта патрабуе свячасовай і ўсебаковай падрыхтоўкі заводу да торфасэзону.

Што-ж на сёняшні дзень зроблена ў гэтым напрамку? Вельмі мала. З патрэбных 11 лёкамабілёў на заводзе ёсьць толькі 1. 5 лёкамабілёў дагэтуль яшчэ ня сьвернуты ільнапяньковым абʼяднаньнем. 4 павінны быць атрыманы з Людзінкаўскага машынабудаўнічага заводу, але і яны таксама не дастаўлены.

Падрыхтоўка балот ідзе вельмі слаба. Да свячасовага скончэньня капаўных работ і раскарчоўкі трэба, каб штодзённа працавала па меньш 150 рабочых, працуе-ж толькі 35.

Вярбоўка рабочых пачалася з вялікім спазьненьнем. Хаця кіраўніцтва заводу і лічыць, што завербавана 61 проц. патрэбнай колькасьці, але значная частка з іх яшчэ не ахоплена дагаворамі і не арганізавана ў брыгады.

Для таго, каб поўнасьцю забясьпечыць жыльлём 2.000 рабочых, якія будуць заняты на торфаразпрацоўках, трэба да пачатку сэзону набудаваць 16 баракаў, 3 інтэрнаты і 7 чатырохкватэрных дамы. Адтак, ні адзін з абʼектаў дагэтуль ня скончан. Загатоўленыя 2.000 кбм. будматэрыялу знаходзяць у лесе і кіраўніцтва заводу ня прымае нівіхіх захадаў да яго вывазкі.

К.

Да торфасэзону не падрыхтаваліся

БАРЫСАЎ. (Наш. кар.). Вярбоўка рабочых на торфазаводах Барысаўскага раёну праходзіць нездавальняюча. Так, завод «Чырвоны Кастрычнік» завербаваў 75 проц. патрэбнай колькасьці, «Узгунар» — 70 проц.

Дрэнная справа з падрыхтоўкай машын да торфасэзону. Як на дным, так і на другім торфазаводах рамонт машын распачаўся з вялікім спазьненьнем і зараз праходзіць вельмі марудна. Ня лепшае становішча і з снабжэньнем заводаў спэцвопраткай, прыладамі і прадуктамі. Белторф, перадаўшы заводы опажыўцом, выключыў іх з цэнтралізаванага снабжэньня. Спажыўцы таксама ня маюць фондаў. Заводу «Узгунар» для сэзону патрэбна 8.000 пар брэзэнтавых бахіл, 3.000 пар лапцей, 500 спэцгарнітураў і 500 пар ботаў; на сёняшні дзень нічога яшчэ не атрымана. Такое-ж становішча і на заводзе «Чырвоны Кастрычнік».

Партыйна-масавую работу ў часьцях РСЧА — на службу ўзмацненьню баявой падрыхтоўкі

Выканаць баявы лёзунг тав. Варашылава

За мінулы год часьці М-скай стралковай дывізіі, Беларускага корпусу на аснове шырока разгорнутага сацнаборніцтва і ўдарніцтва, бальшавіцкай работы партарганізацыі маюць вялікія дасягненьні ў справе баявой падрыхтоўкі. Узьнялася баяздольнасьць часьцей, вырас і ўзьняў сваю кваліфікацыю камандны склад. Значна пашырыў свае найсковыя веды палітскład.

У выніку ўпартай работы партарганізацыі па складзе на клясавым выхаваньні байцоў, за час збору пераменнага складу і навабранцаў падана 3.667 заяў аб уступленьні ў калгасы. Чырвонаармейцы-пераменьнікі падпісаліся на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады» на 280.538 руб.

Партарганізацыя вырасла за лік лепшых ударнікаў-байцоў і камандзіраў за 1931 год на 754 чал. Ад пераменнага складу дывізіі падана заяў аб уступленьні ў партыю 796 і ў камсамол — 597. Гэта сьведчыць аб узросшым аўтарытэце партарганізацыі і бязьмежнай адданасьці чырвонаармейскіх мас барацьбе за генэральную лінію партыі. Посьпехаў у сваёй рабоце партарганізацыя дабілася, дзякуючы бязьлітаснаму змаганьню супроць правага апартунізму, галоўнай небяспекі на даным этапе, «левых» загібшчыкаў і прымірэнцтва.

Разам з тым, трэба адзначыць, што нашы дасягненьні яшчэ не адказваюць поўнасьцю патрабаваньням РКС і ПУРСЧА. Частка партарганізацый спазьнілася з распрацоўкай ліста тав Сталіна, а ў некаторых часьцях п. дадаканілі адразу высока-палітычнага значэньня гэтага гістарычнага дакументу. Ня ўсімі часьцямі выкананасьць загад аб усваеньні праграмы палітзаняткаў камуністамі і камсамольцамі на «добра» і ўсімі чырвонаармейцамі ня ніжэй, як «здавальняюча». Некаторыя часьці маюць значны процант слаба усвоіўных палітзаняткі. Пастановы дывпартканфэрэнцыі павінны мабілізаваць увагу ўсіх партарганізацый на павышэньне якасьці маркісцка - ленінскага выхаваньня чырвонаармейскіх мас, на палепшэньне стану палітзаняткаў.

Дасягненьні, якія ёсьць у сэнсе аўладаньня тэхнікай часьцямі дывізіі, не павінны задавольваць партарганізацыі і начальніцкі склад. Яшчэ шмат трэба працаваць на пытаньнях камандзірскай вучобы.

У паасобных падразьдзяленьнях дывізіі агітмасавая работа яшчэ не перабудавана тварам да тэхнікі. Ленінскія куткі і клюбы пазвычай слаба асьвятляюць работу асобных падразьдзяленьняў па пытаньнях палітычных заняткаў і барацьбы за аўладаньне тэхнікай.

Задача ўсіх партыйных і камсамольскіх арганізацый, кожнага камуніста і камсамольца — забясьпечыць бальшавіцкай работай выкананьне асноўнага лёзунгу тав. Варашылава: «Піводнага адстаючага вучастку баявой падрыхтоўкі, піводнага адстаючага ў баявой вучобе байца і камандзіра».

Дракахруст.

Узорныя паказальнікі бальшавіцкай работы

Партарганізацыя №-скага стралковага палка Беларускай дывізіі свячасова разгарнула прапрацоўку пастаноў XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б. Усе пастановы канфэрэнцыі і зьезду адлюстраваны на ўсёй сыстэме масавай работы. У выніку праведзенай работы значна павысіўся энтузіязм чырвонаармейцаў і камандзіраў у пытаньні ленінскага выхаваньня і аўладаньня вайсковай тэхнікай. Павысіўся аўтарытэт і рост партыйных і камсамольскіх арганізацый. За студзень і люты 1932 год лепшымі ўдарнікамі з ліку рабочых і перадавікоў калгасьнікаў падана заяў аб уступленьні ў партыю 65 і ў камсамол — 120. Камсамольская арганізацыя ідэалёгічна вырасла, павысілася адказнасьць партыйнага ядра за стан работы.

У палку добра пастаўлена камандзірская вучоба, як асноўнае зьвяно ўмацаваньня баявой падрыхтоўкі палка. Вырас аўтарытэт камандзіра, умацавалася яго воля, ініцыятыва, рашучасьць і павысілася адказнасьць да вайскова-палітычнага і тэхнічнага яго ўдасканаленьня.

Ёсьць значныя посьпехі ў справе выкананьня лёзунгу правадыра партыі тав. **Сталіна:** «Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай». Палепшылася якасьць захаваньня зброі. Павысіўся процант выкананьня індывідуальнай стральбы чырвонаармейцамі і камандзірамі. Напрыклад, апошняя кантрольная стральба пачскладу выкананна з вінтовак ручных і станкавых кулямётаў на «выдатна», з рэвальвэру — на «добра».

Побач з тым, што ў палку ёсьць сотні ўдарных аддзяленьняў, дзесяткі ўдарных разьдзелаў без адзінага дысцыпліннага ўчынку, некаторыя падразьдзяленьні палка слаба праводзяць работу вакол пытаньня ўсьведамленьня сутнасьці рэвалюцыйнай вайсковай дысцыпліны. Масава - палітычная і наглядная агітацыя яшчэ поўнасьцю не пастаўлены на службу ўмацаваньня дысцыпліны і ўсёй баявой падрыхтоўкі.

Узрастаючая побяспека нападу на СССР патрабуе ад бальшавікоў, начскладу і ўсіх байцоў палка яшчэ больш павысіць клясавую пільнасьць, забясьпечыць полк да баявой гатоўнасьці ў кожную мінуту. Задача партыйных арганізацый — арганізаваць шырокія масы чырвонаармейцаў і начскладу на выкананьне задач, пастаўленых Рэвваенсаветам.

Пратасэвіч.

Палкавая школа ў першых радох

Масавая работа ў часьцях Чырвонай армії адыгрывае надзвычай вялікую ролю ў справе выкананьня загаду Рэвваенсавету СССР аб узмацненьні баявой палітычнай падрыхтоўкі.

Партарганізацыі і паліторганы Барысаўскага гарнізону гэтаму пытаньню надалі вялікае значэньне. Да 14-й гадавіны РСЧА пры дапамозе шэфскіх арганізацый добра абсталяваны ленкуткі, у якіх праводзяцца гутаркі, стралковыя вечары. Арганізаваны тэхнічныя гурткі, у якіх чырвонаармейцы ў па-оза школьны час знаёмяцца з навейшай тэхнікай. Арганізаваны фотакораўскія гурткі, якія наглядна адбіваюць вучобу і зьберажэньне тэхнікі. Гэтыя формы наглядная агітмасавай работы ўжо далі добрыя вынікі. Напрыклад, полкшкола №-скага палка стральбу першага практыкаваньня выканала на 96 проц. У гэтым-жа палку па агітмасавай рабоце першае месца займае таксама полкшкола.

Гэтыя посьпехі неабходна замацаваць і разьвіваць у далейшым.

Нэйдлін.

Змагацца за першынства

У справе праверкі рэалізацыі ўказаньняў Рэвваенсавету па ўзьнаўленьні стралковай падрыхтоўкі на вышэйшую ступень Беларускай дывізіяй абвешчан стралковы Варашылаўскі конкурс. У конкурс свячасова ўключыўся чацьверты стралковы полк.

Вакол конкурсу праведзена вялікая растлумачальная работа ва ўсіх падразьдзяленьнях палка. Умовы конкурсу даведзены да кожнага байца ў паасобку. Шырока разгорнута ўся масавая работа, сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Праведзеныя напярэдніх стрэльбы гавораць за тое, што полк з гонарам выканае ўзятыя на сябе абавязкі. Полкшкола з вінтовак выканала практыкаваньне на 96 проц., са станковых кулямётаў — на 100 проц. Роты малодшых камандзіраў практыкаваньне выканалі на 100 проц.

Усе падразьдзяленьні палка пераключыліся ў пытаньні стралковай падрыхтоўкі на работу згодна ўказаньняў новага курсу стрэльб 1932 г. Побач з гэтым ёсьць некаторыя падразьдзяленьні, якія ўсю сваю стралковую падрыхтоўку не перабудавалі па новаму. Да гэтых падразьдзяленьняў адносіцца гаспадарчая рота і штабныя адзінкі. Камандваньнем палка даны канкрэтныя ўказаньні гэтым падразьдзяленьням аб пераводзе ўсёй стралковай падрыхтоўкі прыстасоўна да запатрабаваньняў новага курсу стрэльб.

З боку начейных падразьдзяленьняў і паасобных лепшых стралкоў патрэба канкрэтная практычная дапамога слабейшым падразьдзяленьням і слабейшым стралком у падразьдзяленьнях. Трэба ва ўсёй далейшай рабоце партыйным, камсамольскім арганізацыям і ўсяму начальніцкаму складу дабіцца, каб полк аўладаў стралковай справай на «выдатна» і каб вышаў у дывізіі на першае месца.

А. Кроя.

За далейшае паглыбленае вывучэньне

Пастановы XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б у №-кім канвойным палку распрацаваны праз сыстэму палітзаняткаў партыйна-камсамольскіх школ і розныя віды пазашкольнай работы.

Праведзеная праверка ўсваеньня палітзаняткаў пастаноў XVII партканфэрэнцыі паказала: па школе ўсваеньне камуністамі на «добра» — 68 проц., камсамольцамі—46 проц., беспартыйнымі — 47, «здавальняюча»— камуністамі на 28 проц., камсамольцамі — 46 проц., беспартыйнымі — 50 проц. Процант усвоіўшых слаба сярод камуністаў і камсамольцаў надае на нядаўна прынятых у арганізацыю.

У часе прапрацоўкі пастаноў XVII партканфэрэнцыі падана заяў аб прыёме ў партыю 50, і ў камсамол — 60.

Зараз перад партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі палка стаіць важнейшая задача паглыбленьня вывучэньня пастаноў усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б. Ня можа быць ніводнага камуніста, камсамольца, беспартыйнага, які-б не разумеў добра тых задач, якія пастаўлены пастановамі канфэрэнцыі і зьезду КП(б)Б. Цэнтр цяжкасьці работы па вывучэньні пастаноў трэба пераключыць на масавую работу ў падразьдзяленьнях палка.

Партыйным і камсамольскім арганізацыям па лініі індывідуальнай і калектыўнай распрацоўкі матэрыялаў неабходна наладзіць сыстэматычны кантроль і дапамогу паасобным камуністам і камсамольцам.

Ф—н.

Рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна — ў цэнтры ўвагі калдагаворнай кампаніі

Вынік шырокай мабілізацыі мас

Сярод перадавых прадпрыемстваў, якія ўзорна праводзяць калдагаворную кампанію, адно з першых месц займае цукерная фабрыка «Камунарка» (1.150 работніц і рабочых). Пачынаючы з 27 лютага апошні этап кампаніі — прапрацоўку і перазаключэньне новага калдагавору, кіраўніцтва фабрыкі разам з усім рабочым калектывам увязала гэту работу з канкрэтным планам ліквідацыі студзеньскага прарыву ў прамфінпляне (недавыкананьне праграмы на 9,6 проц.) да дня падпісаньня новага калдагавору — 15 сакавіка.

«Камунарка»—адно з дзесяці прадпрыемстваў кандытэрскай прамысловасьці Савецкага Саюзу, якія заключылі паміж сабой дагавары на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшым выкананьні прамфінпляну і масавай рабоце. На лепшае правядзеньне калдагаворнай кампаніі «Камунарка» заключыла дагавары сацспаборніцтва з Маскоўскай фабрыкай «Рот Фронт» і Гомельскай — «Спартак».

Праект новага калдагавору быў абмяркаваны у кожнай брыгадзе, потым кожнай прафсэкцыі па зьменах — пры 100-процантным наведваньні. У кожнай брыгадзе былі створаны тройкі для збору і прапрацоўкі рабочых прапаноў. Для больш глыбокага азнаямленьня з калдагаворам, была скарыстана 8-я гадзіна тэхнічнай вучобы. Тры разы засаб па гадзіне пэхі ў поўным складзе наладжвалі разбор кал дагавору, прычым ужывалі мэтад «віктарыны» — пытаньні і адказы. У гэтай калдагаворнай «віктарыне» прынялі актыўны ўдзел 600 чалавек —больш паловы ўсяго калектыву.

Асабліва добрыя вынікі дало абмеркаваньне калдагавору па прафсэкціях. Былі ўнягнуты такія групы рабочых, якія раней прымалі ўдзел толькі фармальна. Напрыклад, сход конюхаў і возчыкаў патрабаваў уключэньня ў калдагавор пункту аб чытцы лекцый мэтэрынарнымі дактарамі па пытаньнях догляду коняй, першай дапамозе коням у нясчасных выпадках і г. д.

Масавае дэтальнае абгавораньне калдагавору дало 160 прапаноў, галоўным чынам рацыяналізатарскага характару. Адна толькі прапанова аб тым, каб зрабіць паасобныя трубы замест адной цэнтральнай да вакуўм-апаратаў, выканаўшая праз некалькі дзён, павялічыла выпрацоўку з 1.300 да 2.300 клгр. Рад іншых прапаноў аб скарыстаньні пары, гарачай вады, і інш. далі значную эканомію апалу.

КАЛЯ 100 ПРАПАНОЎ УКЛЮЧАНЫ Ў НОВЫ КАЛДАГАВОР. Уключана патрабаваньне рабочых аб арганізацыі тэхнічнай бібліятэкі. На гэту справу адміністрацыя разам з фабкомам асігнавала 1.000 руб. вырашана ахапіць 8-й гадзінай тэхнічнай вучобы 600 вытворчых рабочых з 800. Уключана прапанова рабочых — не выдаваць спэцабутку тым прафэсіям, якія не маюць у ім патрэбы (работніцам завёрткі, бісквітнага цэху). Адпаталосна прынята прапанова — увесьці зьменна-сустрэчнае плянаваньне ў 70 проц. вытворчых брыгад, перавесьці ўсіх рабочых на зьдзельшчыну (зараз ужо ахоплена зьдзельшчынай 96 проц. калектыву). Тры гаспадарча-разрахунковыя брыгады — Куперштока, Дабравольскага і Тайца прапанавалі аплачваць прастоі не па віно рабочых у разьмеры 35 проц., а не 50 паводле закону. Сваю прапанову брыгады матывуюць тым, што пры ўважлівых адносінах да работы ўсяго калектыву і больш гібкім кіраўніцтве адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, прастоі можна давесьці да нуля. У прыватнасьці, рабочы карамельнага цэху тав. Мядзіка ўнёс каштоўную прапанову: улічваючы, што Менскія мэталапрацоўчыя заводы не заўсёды свячасова могуць выканаць аварыйныя заказы іншых прадпрыемстваў, — паставіць пытаньне перад гарсаветам аб стварэньні гарадзкой мэханічнай рамонтнай майстэрні выключна для ўсякіх бягучых рамонтаў абсталяваньня. І нават указаў канкрэтна, дзе такую майстэрню можна арганізаваць — на Лахаўцы, у майстэрнях сучаснай інвалідкай арцелі.

Для ліквідацыі ўраўнілаўкі рабочыя прапанавалі разьмяркаваць фонд павялічэньня зарплаты (на 7,3 проц.), выходзячы са значэньня вядучых прафэсій.

Цікавая прапанова рабочага тав. Грынбэрга. Ён высоўвае пытаньне: чаму прадпрыемствы павінны плаціць за судовыя справы? Амаль кожны дзень фабрыка аплачвае сьведкаў, якія выклікаюцца ў народны суд па розных прыватных спрэчках. Адзін рабочы абляяў другога — і цягнецца хвост сьведкаў у народны суд, а фабрыка плаці за «законныя» прагулы. Тав. Грынбэрг прапануе зьмяніць закон: сьведкаў павінна аплачваць не прадпрыемства, а асуджаны бок.

Масавая прапрацоўка калдагавору выклікала магутны ўздым энтузіязму. Студзеньскі прарыў ліквідаваны датэрмінова — не 15, а 13 сакавіка. Самаабавязацельствы ўдарнікаў — арганізаваць яшчэ 13 гаспадарча-разрахунковых брыгад (у дадатак да 18) выкананы. 226 чалавек у дадатак да 660 абвясьцілі сябе ўдарнікамі. 1 сакавіка фабрыка рапартавала аб 100 проц. ахопе ўсяго калектыву прафчленствам. 16 работніц падалі заявы аб прыёме іх у партыю. Фінплян першага кварталу перавыкананы. Поўнасьцю ліквідаваны прагулы: за студзень было 0,37 проц., за 25 дзён лютага — 0,22 проц., а за 15 дзён сакавіка ніводнага прагулу.

Значна палепшылася якасьць прадукцыі. На кожным працэсе работы вылучана адказная асоба за якасьць, члены ІТР прымацаваны да гаспадарча-разрахунковых брыгад, устаноўлен кантроль над работай лябараторый.

За гэты-ж час прайшла масавая праверка складу ўдарнікаў і выдача новых «картак ударнікаў». Кожная кандыдатура прайшла праз сход брыгады, зьмены, заводзкія - арганізацыі. Для забясьпечэньня ўдарнікаў вызначаны спэцыяльныя прэміяльныя фонды прамтавараў і прадуктаў.

Цікава і паступае. Настаўнікі і старшыя клясы падшэфнай фабрыкі 12-й сямігодкі ў парадку палітэхнізацыі прапрацавалі калдагавор фабрыкі. За актыўны ўдзел у палітэхнізацыі і лепшую пастаноўку пасьцігазэтнай работы — пастаўніца, кіраўнік піянэрбазы і вучань атрымалі «картачкі ўдарніка».

За лепшае правядзеньне калдагаворнай кампаніі тры старшыні зьменных прафкамітэтаў — т.т. Лазоўская, Радкевіч і Сінкевіч — прэміяваны.

Канчатковы праект калдагавору прапрацаваны ў брыгадах, потым зацьвердзкан фабрычнай канфэрэнцыяй.

Калектыў фабрыкі «Камунарка» можа з гонарам падвесьці вынікі вялікай работы, праробленай дзякуючы правільнаму партыйнаму і прафсаюзнаму кіраўніцтву і сапраўды шырокай мабілізацыі мас на аснове выкананьня 6 умоў тав. Сталіна.

П—н.

АГЛЯД ДРУКУ

Створым мастацтва. вартае эпохі

(*„Літаратура і мастацтва“*)

Новым, яркім і глыбокім фактам перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі, росту культурнай рэвалюцыі, культурнага ўзроўню рабочай клясы і працоўных мас Савецкай Беларусі выглядзеньне выхад беларускай газэты «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА» (орган фэдэрацыі абʼяднаньняў савецкіх пісьменьнікаў і Галоўмастацтва БССР).

У шырокую рачаіснасьць ператвараецца ленінская мысьль правадыра нашай партыі т. Сталіна аб тым, што «пэрыяд дыктатуры пралетарыяту і будаўніцтва сацыялізму ў СССР ёсьць пэрыяд росквіту нацыянальных культур, сацыялістычных па зьмесьце і нацыянальных па форме».

На той-жа бок мяжы, у акупаванай Заходняй Беларусі польскі фашызм вядзе дзікую расправу над культурай і мовай працоўных мас розных нацыянальнасьцяй. Фашысцкія «цывілізатары» душаць кожнае рэвалюцыйнае слова. Агнём і мячом карных экспэдыцый разбураюцца беларускія школы і культурныя ўстановы. Рэвалюцыйная літаратура ЗБ загнана ў глыбокае падполье.

Літаратура - вострая зброя клясавай барацьбы, зброя камуністычнага выхаваньня найшырэйшых працоўных мас, ператварэньня іх у актыўных і сьвядомых будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Роля мастацтва і ў прыватнасьці літаратуры асабліва ўзрастае цяпер у новых умовах, у новай абстаноўцы сацыялістычнага будаўніцтва.

У прывітальні газэце «Літаратура і Мастацтва» сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч піша:

> «ЦК упэўнен, што газэта будзе сапраўдным баявым органам у змаганьні за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку, за гегемонію пралетарскай літаратуры ў БССР, у змаганьні за бальшавіцкую партыйнасьць пралетарскага мастацтва, за стварэньне літаратура і мастацтва — пралетарскіх па зьмесьце і нацыянальных па форме».

Гэта ўказаньне — баявая дырэктыва для газэты «ЛІМ». У сваёй практычнай рабоце газэта павінна ператварыць гэту дырэктыву ў канкрэтныя справы.

Першыя тры нумары «Літаратуры і Мастацтва» пераканаўча кажуць аб тым, што газэта правільна разумее сваю ролю, правільна разгортвае змаганьне за выраўнаньне задач, якія пастаўлены партыяй перад пралетарскім мастацтвам.

***

БелАПП, беларуская пралетарская літаратура, а таксама і пралетарскія літаратуры нацыянальных меншасьцяй, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, дабіліся значных перамог, заваявалі ідэйную гегемонію і вядуць пасьпяховую барацьбу за гегемонію творчую. Газэта «ЛІМ» зусім правільна піша, што

> «у чацьверты і заключны год пяцігодкі БССР, як сустаўная частка Савецкага Саюзу, уступіла з радам значных дасягненьняў на фронце літаратуры і мастацтва, як беларускай, а таксама і літаратуры і мастацтва працоўных нацменшасьцяй».

Усё-ж, ня гледзячы на гэтыя посьпехі, мастацкая літаратура яшчэ значна адстае ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Культурны ўзровень, культурныя запатрабаваньні нашага савецкага рабочага значна вырасьлі і іх яшчэ не пакрываюць творчыя дасягненьні пралетарскай літаратуры. Газэта «ЛІМ» рэзка і правільна ставіць пытаньне аб тым, што БелАПП, як вядучая арганізацыя і асноўны правадзік лініі партыі ў літаратуры, што арганізацыі пралетарска-калгаснай і лачафаўскай літаратуры, а таксама і абʼяднаньні другіх галін мастацтва

> «не разгарнулі яшчэ дастатковай работы па авалоданьні марксыцка-ленінскім мэтадам творчасьці, па барацьбе за масавасьць руху, за перабудову работы па-новаму».

Зусім законным выразам узросшых патрабаваньняў рабочай клясы да пралетарскай літаратуры выявілася дыскусія паміж шматмільённым камсамолам і РАПП, паміж «Комсомольской правдой» і «Літаратурной газетой». Гэта дыскусія адыграла надзвычай вялікую ролю ў перабудове пралетарскага літаратурнага руху, якая зараз, пад кіраўніцтвам і па аснове вычарпальных указаньняў партыі, праводзіцца па ўсім фронце.

Зрухі вытворчай перабудовы БелАПП сьцьвярджаюцца і павялічваюцца творчай дыскусіяй у МенАПП, якая шырока разгортваецца і праходзіць з уздымам. **ЗАДАЧА «ЛІМ» — узьняць творчую дыскусію ў БелАПП на ВЫСОКУЮ ТЭАРЫТЫЧНУЮ ВЫШЫНЮ.**

Перабудова фронту літаратуры і мастацтва ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай, з новымі задачамі немагчыма без

> «БАРАЦЬБЫ ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ ПАРТЫЙНАСЬЦЬ, ЗА КЛЯСАВУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ, ЗА БАЛЬШАВІЦКІ СТЫЛЬ У РАБОЦЕ, ЗА МАСАВАСЬЦЬ УСЯГО ЛІТАРАТУРНАГА РУХУ, ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ САМАКРЫТЫКУ».

Без разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, ня можа быць руху наперад.

У БелАПП самакрытыка разгорнута яшчэ слаба. Такое становішча проста абавязвае газэту «Літаратура і Мастацтва» яшчэ больш шырока ставіць пытаньні перабудовы пралетарскага літаратурнага фронту, значна шырэй разгортваць бальшавіцкую канкрэтную самакрытыку, каб пасьпяхова змагацца.

> «ЗА МАРКСЫЦКА - ЛЕНІНСКІ СЬВЕТАПОГЛЯД, ЗА ІДЭЙНУЮ І МАСТАЦКУЮ ЯКАСЬЦЬ НАШЫХ ТВОРАЎ, РАШУЧА ВЫКРЫВАЦЬ УСЯКІЯ БУРЖУАЗНЫЯ І АПАРТУНІСТЫЧНЫЯ ТЭОРЫІ І ТЭОРЫІКІ НА ЛІТАРАТУРНЫМ ФРОНЦЕ».

Разам з тым трэба зараз-жа разгарнуць шырокую крытыку нашай літаратурнай крытыкі.

БелАПП'ам і яго асноўным атрадам — менскай асацыяцыяй—праведзена сур'ёзная работа па закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру. Рады пралетарскага літаратурнага фронту папоўніліся новымі кадрамі.

Цяпер работа па закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру набыла якасна новы, вышэйшы этап. «ЛІМ» у глыбокім і цікавым артыкуле сакратара БелАПП'у тав. Міхася Лынькова правільна ставіць пытаньне, што

> «перад намі паўстаюць неадкладныя задачы замацаваньня наяўных посьпехаў, забясьпячэньня далейшага росту гэтага руху, як ушырэ, так і асабліва ў глыбіню, у бок якаснага палепшэньня ўсёй работы з ударнікамі-рабочымі, закліканымі ў літаратуру, у бок наладжваньня сталай выхаваўчай работы з імі, сыстэматычнай высокакласнай творчай вучобы».

Газэта «Літаратура і Мастацтва» заклікана адыграць асабліва вялікую ролю ў справе закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру, ў справе іх выхаваньня і вучобы. Тым больш, што па гэтым вучастку, як правільна адзначае газэта, дасягненьні БелАПП не замацаваны, ёсьць сур'ёзныя зрывы, а ў некаторых гарадох работа яшчэ зусім не распачата. Нават у Менску, дзе ёсьць асабліва спрыяючыя ўмовы, у апошні час назіраецца значнае аслабленьне работы з закліканымі ўдарнікамі.

Тут трэба дабіцца сталай і сыстэматычнай работы. Выхаваўчая работа і марксыцка-ленінская вучоба з ударнікамі павінна быць значна павялічана, абкружана большай увагай БелАПП'аўскіх арганізацый, заводзкіх партыйных ячэек і калектываў, камсамолу.

І зусім правільна тая ўстаноўка, «ЛІМ», што трэба

> «арганізоўваць крытыку на фабрыках і заводах. Арганізоўваць заводзкія гурткі крытыкі».

Гэтае вялікай палітычнай важнасьці справа павінна быць у цэнтры ўвагі і БелАПП і газэты «ЛІМ». Пасьпяховае выраўнаньне гэтай задачы папоўніць рады нашага марксыцка-ленінскага крытычнага фронту новымі пралетарскімі кадрамі, узьніме крытыку на вышэйшую ступень.

Распачаты па ініцыятыве «Комсомольской правды» творчы агляд маладзёжнай літаратуры мае вялікае палітычнае значэньне. Адтак, гэта справа ў БССР разгорнута яшчэ зусім нездавальняюча.

> «Творчы агляд павінен пакласьці пачатак сыстэматычнай дапамогі камсамольскім і юнацкім пісьменьнікам у справе стварэньня магутнай літаратуры, якая-б адлюстроўвала ўдзел маладых рабочых і калгасных ударнікаў у сацыялістычным будаўніцтве і якая-б выяўляла станоўчага тыпа — героя пяцігодкі».

«Літаратура і Мастацтва» уключыліся ў агляд камсамольскай літаратуры і даю тут павучальныя ўзоры работы. У другім нумары газэта прысьвячае гэтаму пытаньню перадавы артыкул і цэлую старонку крытычнага матар'ялу. У трэцім дасьцца разгляд творчасьці камсамольскага паэта тав. Ліхадзіеўскага. Зразумела, нельга гэтым абмяжоўвацца, трэба павялічаць свой удзел у аглядзе маладзёжнай літаратуры, узьнімаць ідэйна-якасны бок гэтай справы.

Задача стварэньня магнітабудаў мастацтва, паказу нашай сацыялістычнай эпохі высока-мастацкімі, насычанымі ленінскай партыйнасьцю творамі — задача нялёгкая і складаная. Яна можа быць вырашана толькі пры ўмове глыбокага аўладаньня тэорыяй Маркса — Леніна — Сталіна, толькі праз актыўны ўдзел пісьменьнікаў у практыцы сацыялістычнага будаўніцтва.

Добра робіць «ЛІМ», калі ўжо ў другім нумары дае дзелавую падборку пад лёзунгам:

> «ТРЭЦЯЯ БАЛЬШАВІЦКАЯ ВЯС. НА ПАТРАБУЕ ТВОРЧАГА І ПРАКТЫЧНАГА ЎДЗЕЛУ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА. ДАЦЬ ТВОРЫ ВЫСОКАЙ МАСТАЦКАЙ ВАРТАСЬЦІ ПРА БАЛЬШАВІЦКУЮ ВЯСНУ!»

***

Перад газэтай «ЛІМ» — новым змагаром за вялікае бальшавіцкае мастацтва — стаяць адказныя задачы. Гэтыя задачы ак

Інтэрнацыянальны зьлёт рэвалюцыйнай моладзі на граніцы трох краін

Бурныя дэманстрацыі моладзі па ўсёй Германіі

БЭРЛІН, 26. Ня гледзячы на забарону ўсегерманскага дня працоўнай моладзі, учора па ўсёй Германіі адбываліся дэманстрацыі і мітынгі рэвалюцыйнай моладзі пад кіраўніцтвам камсамолу. Недалёка Марыенбургу ў пагранічным трыкутніку трох краін адбыўся зьлёт германскіх, польскіх і данцыгскіх маладых рабочых. На пагранічным слупу быў узьнят чырвоны сьцяг і камсамольцы пакляліся ўсімі сіламі змагацца супроць небясьпекі імпэрыялістычнай вайны ў сваіх краінах. Была распаўсюджана адозва на трох мовах, у якой рабочая моладзь заклікалася прымаць удзел у антыімпэрыялістычнай барацьбе.

Адначасова адбыўся зьлёт маладых пралетараў Усходняй Прусіі, Мэмэля і Літвы.

У Бэрліне былі праведзены мітынгі моладзі перад буйнейшым заводам Сіэмэнс і Вэркор, у прамысловым раёне Марыенфэльдэ і г. д. Маладыя рабочыя пратэставалі супроць забароны ўсегерманскага зьлёту і пакляліся весьці барацьбу супроць вырабу і транспарту ваенных матар'ялаў. У рабочых раёнах Бэрліну таксама адбываліся дэманстрацыі камсамолу. 3.000 маладых рэвалюцыйных рабочых наведалі магілы Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург. Ня гледзячы на забарону жалобнай дэманстрацыі да магілы забітых правадыроў на Франкфурцкай алеі сабралася вялізарная маса рабочых, якія з пяяньнем «Інтэрнацыяналу» накіраваліся на могілкі. Паліцыя арыштавала шмат маладых рабочых.

У Браўншвэйгу (цытадэлі нацыянал - сацыялістаў) камсамольцы наладзілі лятучы мітынг перад буйным машынабудаўнічым заводам «Міаг». На мітынгу была прынята рэзалюцыя пратэсту супроць гітлераўскага зьлёту, які, ня гледзячы на ўвядзеньне ў Германіі палажэньня «грамадзянскага міру», адбудзецца 27 сакавіка ў Браўншвэйгу. (ТАСС)

ЗАБАРОНА МІЖРАБПОМА І МОПР'у Ў ЧЭХА-СЛАВАКІІ

ПРАГА, 25. Паліцыя учора і заўчора правяла форменны налёт на арганізацыі міжрабпому і МОПР'у па ўсёй Чэха-Славакіі ў сувязі з забаронай іх дзейнасьці. Мясцовыя групы міжрабкому і МОПР'у распушчаны: іх мае маёмасьць канфіскавана; шмат актывістаў міжрабпому і МОПР'у арыштаваны. Апрача таго, праведзены вобыскі ў прыватных кватэрах у 500 актывістаў МОПР'у і міжрабпому, у тым ліку ў старшыні «камітэту дапамогі Закарпацкай Украіне і старшыні таварыства зьбліжэньня з СССР» прафэсара Нэедлага. У радзе месц паліцыя правяла таксама вобыскі ў сакратарыятах мясцовых арганізацый кампартыі і чырвоных прафсаюзаў. Дзейнасьць арганізаванага чэха-славацкай сэкцыяй міжрабпому «камітэту дапамогі» галадаючаму працоўнаму насельніцтву Закарпацкай Украіны забаронена. Усе грашовыя сродкі, а таксама ўсякага роду рэчы, сабраныя ў фонд дапамогі Закарпацкай Украіне, канфіскаваны. У Празе ўлада канфіскавала 35 тыс. чэха-славацкіх крон і 23 скрыні з вопраткай, прызначанай для Закарпацкай Украіны.

Надзвычай характэрна афіцыяльная матывіроўка забароны міжрабпому і МОПР'у. МОПР'у прыпісваецца «недапушчальнае ўмяшканьне ў дзяржаўную дзейнасьць органаў улады на Закарпацкай Украіне».

Адносна забароны міжрабпому ў распараджэньні гаворыцца, што «дзейнасьць гэтай арганізацыі служыць палітычным мэтам кампартыі і прапаганды за СССР. Тым самым міжрабпом становіцца цалкам на плацформу праграмы Камінтэрну і імкнецца да гвалтоўнага ўвядзеньня рэжыму, падобнага да рэжыму ў СССР».

Роспуск міжрабпому і МОПР'у выклікаў вялікае абурэньне сярод рабочых. У Рэйхэнбэргу, Бруквураўскай, Востраве і іншых мясцох адбыліся дэманстрацыі пратэсту супроць забароны. Цэлыя калектывы рабочых у адказ на забарону ўступаюць у міжрабпом і МОПР. Агідней шую ролю адыгрывае ва ўсёй гісторыі з забаронай міжрабпому і МОПР'у сацыял-фашысцкі друк. Сацыял - фашысцкае «Чэске Слово» піша: «роспуск міжрабпому і МОПР'у зьяўляецца зразумелай мерай, бо гэтыя арганізацыі зьяўляліся філіямі кампартыі».

Адначасова з роспускам міжрабпому і МОПР'у намесьнік чэха-славацкага міністра замежных спраў Славік выказаў поўнае давер'е кіраўніку мясцовага ўраду Закарпацкай Украіны—Рожнаўу і абвергнуў усе чуткі аб адстаўцы Рожнала.

Германскія фашысты падрыхтоўвалі ў часе прэзыдэнцкіх выбараў дзяржаўны пераварот

Путчысты--пад апекаю ўраду

БЭРЛІН, 25. Вярхоўны суд у Лейпцыгу разглядзеў скаргу нацыянал - сацыялістскай партыі супроць сацыял-дэмакратычнага кааліцыйнага ўраду Прусіі з прычыны канфіскацыі партыйных матар'ялаў у часе вобыскаў у памяшканьнях нацыянал - сацыялістаў (фашыстаў). Пры садзейнасьці старшыні суда паміж істцом і адказчыкам, г. зн. Гітлерам і Зэвэрынгам дасягнута згода аб спыненьні судовага разгляду.

На судзе прадстаўнік прускага ўраду агаласіў ліст германскага міністра ўнутраных спраў і рэйхсвэра Грэнэра да прускага ўраду аб падрыхтоўцы нацыянал - сацыялістаў да путчу. Згодна лісту ваенная арганізацыя гітлераўцаў вяла вучот усіх складаў зброі рэйхсвэры ва ўсіх вобласьцях Германіі і асабліва ў Сілезіі, каб да моманту выступленьня скарыстаць яе. Усюды, дзе да гэтага часу кіраўнікі штурмавых атрадаў ня былі былымі афіцэрамі, назначаны такавыя. Штурмавыя атрады забясьпечваліся амуніцыяй з ліхаманкавай пасьпяховасьцю і сапраўды мелі намер, калі кандыдатура Гітлера на прэзыдэнцкіх выбарах ня пройдзе, зрабіць гвалтоўны пераварот. Прадстаўнікамі путчысцкага напрамку ў нацыянал - сацыялістскай партыі ньяўляюцца: Фрыц, Штрасэр і Фэбэльс.

Але нават цяпер, пасьля гэтых выкрыцьцяў урад зноў пацьвярджае, што і ня думае забараняць нацыянал - сацыялістычную ваенную арганізацыю. Ваеннае міністэрства апублікавала афіцыёзнае паведамленьне, у якім канстатуе, што ліст Грэнэра зусім не азначае, што ўрад заняў якую - небудзь пазыцыю ў адносінах да ўказаных у лісьце фактаў і разам з тым не азначае прызнаньня паліцэйскіх мер прускага ўраду. «Дзеяньні прускага ўраду, — гаворыцца ў паведамленьні, — праведзены па яго ўласнай ініцыятыве». Гэта паведамленьне разглядаецца ў бэрлінскіх палітычных колах, як повы довад абароны і натураньня сацыялістам з боку Грэнэра і як выяўленьне нездавальненьня з поваду мер ураду супроць нацыянал - сацыялістаў. (ТАСС)

Фашысцкая Польшча дамагаецца пазыкі ва Францыі

Узнагарода дырэктара канцэрну „Шнэйдэр Крэзо" вышэйшым ордэнам у мэтах... атрыманьня пазыкі

Варшава, 25 — Новы міністар (без партфэля) Завадзкі дагэтуль ня прыняў спраў, бо ягоны ня парнуўся з Парыжу, дзе ўжо доўгі час знаходзіцца разам з дырэктарам польскага банку Баварскім. Як паведамляюць 23 сакавіка Залескі і Завадзкі, а таксама і пасол у Парыжы Хлапоўскі былі прыняты францускім прам'ерам.

Аб змесьце гутаркі няма ніякіх афіцыяльных вестак. Адначасова сакрэтам палішнэля зьяўляецца той факт, што польскі ўрад робіць нязвычайныя намаганьні для атрыманьня новых пазык ва Францыі. У першую чаргу Польшча стараецца паскорыць выпуск на Парыскай біржы другой серыі чыгуначнай пазыкі ў суме 300 млн. франкаў (гутарка ідзе аб пазыцы на агульную суму каля мільярда франкаў пад залог магістралі Верхняя Сілезія — Гдыня, якая будуецца).

На якія сілы апіраецца польскі ўрад у сваім імкненьні атрымаць новую пазыку, — аб гэтым досыць нескромна паведамляе сёньняшняя «Газэта Варшаўска». Газэта падкрэсьлівае характэрны факт, што міністар фінансаў — Ян Пілсудскі ўнёс прапанову аб узнагародзе дырэктара ваеннага канцэрну «Шнэйдэр-Крэзо» вышэйшым польскім ордэнам «Полёнія рэстытута» за асаблівыя заслугі пры пабудове чыгункі Верхняя Сілезія — Гдыня.

Французская буржуазія не давярае свайму васалу

ВАРШАВА, 26. Карэспандэнт «Курэра Варшаўскага» паведамляе з Парыжу аб перашкодах да разьмяшчэньня на Францыі другога чыгуначнага выпуску для Польшчы ў 300 млн. франкаў. У сувязі з гэтым, паведамляе карэспандэнт, — робяцца спробы заключыць «новую», але некалькі паменшаную пазыку таксама «на патрэбы чыгуначнага будаўніцтва» ў суме 200 млн. франкаў.

Украінская буржуазія замацоўвае згоду з польскім фашызмам

Варшава, 26 Адкрываецца зьезд УНДО ва Львове. У сувязі з вядомай дзейнасьцю польскага ўраду, накіраванай да замацаваньня згоды паміж украінскай буржуазіяй і польскім фашызмам у палітычных колах выяўляецца павышаная зацікаўленасьць да зьезду

ПА СССР

ПАДРЫХТОЎКА ВЯЛІКАЙ АРКТЫЧНАЙ ЭКСПЭДЫЦЫІ

ЛЕНІНГРАД, 26. Усесаюзны арктычны інстытут распрацаваў плян новай вялікай экспэдыцыі, якая выедзе ў пачатку чэрвеня з Ленінграда ва Ўладывасток. Экспэдыцыя будзе зроблена на ледаколе «Сібіракоў». Начальнікам экспэдыцыі назначан праф. Шмідт. Усёй навукова-дасьледчай работай экспэдыцыі будзе ведаць праф. Візэ. Маршрут экспэдыцыі: Ленінград — Скандынавія — Мурманск — Карскае мора — востраў Дыксон — вусьце Енісея. Тут экспэдыцыя папоўніць запасы вугалю, пасьля чаго накіруецца на мыс Чэлюскін, выгрузіць там матар'ялы, высадзіць асабісты склад для пабудовы вялікай палярнай радыёстанцыі. Адсюль экспэдыцыя накіруецца ў мора братоў Лапцевых, дзе будзе зроблена падрабязнае дасьледваньне раёну з мэтай адшуканьня зямлі Саньнікава, якую ў 1900 годзе бачылі геолёг Толь і прамыслоўца Саньнікаў. Потым ледакол «Сібіракоў» пройдзе праліваам Лапцева ва Ўсходня-Сібірскае мора для абсьледваньня мора з мэтай высьвятленьня месцазнаходжаньня так званай зямлі Андроева. У гэтым раёне, т. зн. паміж востравам Урангеля і Нова-Сібірскімі астравамі да гэтага часу ня плавала ні адно судно. У выпадку, калі і гэты раён акажацца непраходным, з прычыны звычайнага скапленьня ў ім ільду, будзе зроблена разьведка пры дапамозе самалёту.

Пасьля таго, як будзе пройдзен Бярынгаў праліў, ледакол «Сібіракоў» парасьпе Ахоцкае мора і накіруецца ва Ўладывасток, абкуль кружным шляхам, г. зн. кругасьветным плаваньнем, вернецца ў Ленінград.

На чале лётнай часткі экспэдыцыі стаіць выдатны лётнік І. М. Іваноў.

На борце ледаколу будуць знаходзіцца прадстаўнікі ўсіх навуковых дысцыплін, зьвязаных з дасьледваньнем Арктыкі. Ледакол будзе весьці капітан Варонін, былы камандзір «Седова». Працямасьць экспэдыцыі разьлічана на поўгода, аднак, прадукты, харчы будуць узяты на два гады, бо ня выключана магчымасьць зімоўкі ледаколу ў ільдох.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Выкананьне прамфінпляну прамысловасьцю Наркамснабу

Паводле вестак Наркамснабу БССР, прамысловасьць Наркамснабу за 2 дэкады сакавіка выканала 59,9 проц. месячнага пляну.

Кандытэрска-макаронная прамысловасьць выканала месячны плян на 64,1 проц., прычым фабрыка «Камунарка» (Менск) — 66,7 проц., кандытэрская фабрыка «Х-ты Кастрычнік» — 70,4 проц., «Чырвоны харчавік» — 74,1 проц., макаронная фабрыка — 68,8 проц., крухмальны завод імя Х-цігодзьдзя БССР — 16,2 проц., «Сьвяцілавічы» — 11 проц.

Прадпрыемствы Белбродаб'яднаньня выканалі месячную праграму на 57,2 проц., прычым праджажавы завод «Чырвоная зарка» — 58,9 проц. (па дрожджах).

Алейна-маргарынавая прамысловасьць выканала месячны плян на 57,6 проц., прычым Віцебскі маслазавод выканаў праграму па алеі ільняным—на 66,2 проц., па жаволі — 74,5 проц.

Белтэкстыльпрадукт даў выкананьне месячнай праграмы на 15,8 проц., Белкантора Саюзхлеба — 62,7 проц. Гоксельпрам — 72,7 проц., Белуціль — 61 проц.

* * *

СЕЛЬГАСМАШЫНЫ

24 сакавіка завод Гомсельмаш выпусьціў 34 сякасарэзкі — 141,7 проц. пляну, 19 сячкарань — 135,7 проц., 10 бульбамялак — 125 проц., 18 бульбасартовак — 128,6 проц. і 8 канопляносартовак — 320 проц.

* * *

23 сакавіка завод «Чырвоны мэталіст» выпусьціў 20 жмыхадрабілак — 105,26 проц., 23 кораніарэзкі — 109,52 проц., 28 бульбакапалак — 175 проц., і 50 бораў «Зіг-Заг» — 69.4 проц. пляну.

НА БЕЛДРЭС

23 сакавіка 1-я БелДРЭС выпрацавала 175 тыс. клв. гадзін энэргіі. Максымум дасягнуў — 9.250 клв., мінімум — 6.000 і сярэдняя — 7.200. Разгрузак ня было.

БУДМАТАР'ЯЛЫ

23 сакавіка камбінат «Камінтэрн» расьпілаваў 193 кбм. сырцу, што складае 84,2 проц. заданьня і выпрацаваў 48,9 кбм. фанэры або 99,1 проц. заданьня.

* * *

23 сакавіка лесапільны завод імя Халтурына расьпілаваў 319,6 кбм. сырцу, або 118,4 проц. заданьня.

У гэты-ж дзень лесазавод «Адраджэньне» расьпілаваў 105 кбм. сырцу, або 90,6 проц.

* * *

23 сакавіка лесазавод «Спартак» расьпілаваў 90,5 кбм. сырцу — 119 проц. заданьня і выпусьціў 614 кам плектаў цэмэнтнай клёнкі — 68 проц. 24 сакавіка заводам расьпілавана 73,4 кбм. сырцу — 96,5 проц. і выпушчана 633 камплекты цэмэнтнай клёнкі, або 70 проц. заданьня.

ЦЬВІКІ. 23 сакавіка дрота-цьвікоўны завод «Чырвоны Кастрычнік» выпрацаваў 4.920 кгр. будаўнічых цьвікоў, што складае 74,5 проц. заданьня. 24 сакавіка заводам выпрацавана 4.980 кгр. будаўнічых цьвікоў, або 75,4 проц. Недавыкананьне праграмы тлумачыцца недахватам дроту-катанкі.

* * *

23 сакавіка завод «Інтэрнацыянал» выпрацаваў 2.381 сотню вінтоў, што складае 99,2 проц. заданьня.

КАХЛІ. З 16 па 20 сакавіка кахляна-плітачны завод «Пралетарый» выпрацаваў 55.400 кахляных пліт, што складае 21,7 проц. месячнага пляну.

ПАПЕРА

23 сакавіка папяровая фабрыка «Спартак» выпрацавала 13,7 тон паперы, або 56,15 проц. заданьня. 24 сакавіка фабрыкай выпрацавана 19,4 тоны паперы, або 69,8 проц. заданьня.

* * *

23 сакавіка на папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка» пракацавала 1 машына, якая выпрацавала 7.089 кгр. паперы, або 44.8 проц. заданьня. 24 сакавіка фабрыкай на 2-х машынах выпрацавана 23.005 кгр. паперы, што складае 64,6 проц.

УГНАЕНЬНІ

За 5 пяцідзеўку сакавіка Крычаўскі фасфарытны завод выпрацаваў 60 тон фасфарытнай мукі, або 13 проц. пяцідзеннага заданьня. Недавыкананьне пляну тлумачыцца недахватам руды, з-за якой завод стаяў 23, 24 і 25 сакавіка.

СКУРА

За 5-ю пяцідзеўку сакавіка гарбарня «Бальшавік» выпусьціла прадукцыі на 140.582 руб., што складае 104,5 проц. заданьня. Першы хромавы цэх выкаваў вытворчае заданьне на 105,9 проц. — выпушчана прадукцыі на 67.256 руб. і другі хромавы цэх — на 106,2 проц., выпушчана прадукцыі на 67.409 руб.

Дэзарганізатараў савецкага гандлю--да суровай адказнасьці

Дзяржаўная інспэкцыя цэн пры НК РСІ БССР пастанаўляе:

За абмерваньне пры водпуску газы — 18 літраў замест 20 літраў і 9½ замест 10½ літраў і разбазарваньне — нам. загадчыка газавай крамы № 26 МЦРК Рапапорта зьняць з работы і справу аб ім перадаць у партколегію.

За несваячасовае рэагаваньне па вышэйадзначаным злоўжываньні загадчыку гэтай крамы Прыдоткас вынесьці суровую вымову з занясеньнем у працоўны сьпіс, папярэдзіўшы, што ў выпадку паўтарэньня будуць прыняты больш суровыя меры.

За самавольнае і незаконнае павышэньне цэн пры водпуску газы — 20 кап. літар замест 19 кап. і абмерваньне — 5⁷/₁₀ літра замест 6 літраў і разбазарваньне — нам. загадчыка крамы № 79 МЦРК Левіна зьняць з работы і справу аб ім перадаць пракурору.

За несваячасовае рэагаваньне на вышэйадзначаныя злоўжываньні загадчыка гэтай крамы Карапоўскага аштрафаваць на 100 руб.

Прасіць камісію па чыстцы савецкага апарату правесьці асабістую чыстку загадчыка газавай крамы № 27 МЦРК Ушакова за сыстэматычнае абмерваньне, няправільны водпуск і разбазарваньне газы.

Згадзіцца з вынесенай пастановай Полацкай РКК-РСІ аб зьняцьці з работы загадчыка крамы № 2 Баранінскага спажывецкага таварыства Шэнэха з перадачай справы ў суд за незаконнае павышэньне цэн на газу, якое мешавалася са злоўжываньнем.

За несваячасовае рэагаваньне на незаконнае ўстанаўленьне цэн на газу ў крамах Бабруйскага райспажыўсаюзу, парушэньні савецкай палітыкі цэн на крупы, махорку, пясок-цукар і інш. — справу аб старшыні Бабруйскага райспажыўсаюзу т. Эрэнбургу перадаць на разгляд партколегіі. Прапанаваць апошняму ня пазьней 25-III 32 г. зьвініцьць усе выяўленыя факты парушэньня савецкай палітыкі цэн.

Паведамленьні

28 сакавіка, у 2 гадзіны дня, у памяшк. гаркому (заля пасяджэньняў) склікаецца НАРАДА сакратароў партколектываў і ячэек КП(б)Б, сакратароў калектываў КСМ і ячэек, старшынь ФЗМК па пытаньні аб правядзеньні пяцідзёньціна па працы бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ.

Гарком, Гар. КК КП(б)Б, Штаб па правядзеньні пяцідзёньніка

— 28 сакавіка, у 11 гадз. дня склікаецца ў ЦКК-НК РСІ (бюро скаргаў) нарада грамадзкіх інспэктароў, кіраўнікоў «ЛК» і атрадаў «ЛК» мадтэхнікуму, хэмтэхнікуму, МІПУ, «Полымя Рэвалюцыі», заў. «Камунар», заў. імя Варацылава, «Чырв. Тэкстыльшч.». Яўка абавязкова.

— 28 сакавіка, у 5 гадз. дня, у памяшк. Менскай абутковай ф-кі (Новамаскоўская вул.) адбудзецца агульны сход падпольшчыкаў - членаў КП(б)Б сумесна з партыйным і камсамольскім калектывамі абутковай ф-кі. Парадак дня: 1) Уступная прамова т. Балціна аб задачах і мэтах т-ва старых бальшавікоў. 2) Разгляд заяў т. т. Кеніга, Кіпенварціца, Спалінскага і Сьвярдловай аб уступленьні ў т-ва старых бальшавікоў. Прысутнасьць усіх падпольшчыкаў—членаў КП(б)Б з партстажам да 1916 г. уключна, якія жывуць у г. Менску, абавязкова. Запрашаюцца члены КП(б)Б, ЛКСМВ і беспартыйныя рабочыя.

Аргбюро па арганізацыі ў БССР філіялу Усесаюзнага т-ва старых бальшавікоў.

— 29 сакавіка, у 6 гадз. веч., у памяшк. гаркому КП(б)Б (пакоі № 14) адбудзецца нарада ўсіх культпрапаработнікаў і прапагандыстаў выпворчых ячэек КП(б)Б па пытаньні тэарэтычнай вучобы прапагандыстаў і культработнікаў. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

Папраўка

У сьпісе складу Цэнтральнага савету прафсаюзаў БССР, зьмешчаным у „Зьвязьдзе" № 67 украінскі наступныя памылкі:

ЗАМЕСТ:	ТРЭБА:
Члены пленуму:	
Вышнікаў	Іваноў (заў. імя Сталіна)
Гураў	Гураў
Шпілёнак	Карпачоў
Пускалёва	Ускалёва
Сідарава	Папала
Пачакала	Пышкала
Кандыдаты пленуму:	
Талівача	Галавач (Жыты РПС)
	Кудраўў
Рэвкамісія:	
Кудраўў	Малінін
Сапожнікаў	Удовін

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

29 сакавіка 1932 г., у 8 гадзін вечара адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД ПАРТКАЛЕКТЫВУ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ
з падрадам дня Аб падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы.
Яўка ўсіх партыйцаў абавязкова.
(Сход адбудзецца ў рэдакцыі „ЗЬВЯЗДЗЕ").

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" СЁНЬНЯ і ШТОДЗЕННА
НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ВЫТВОРЧАСЬЦІ „МЕЖРАБПОМ—ФІЛЬМ"
ДЗЬВЕ СУСТРЭЧЫ
ДРАМА Ў 7 ЧАСТКАХ.
Сцэнары: Я. А. ПРАТАЗАНАЎ
Рэж. Я. УРЫНАЎ, Я. І. УРЫНАЎ
Камэрмэтар В. ОРАНСКІ.
Гук. афармл. Д. БЛОК.
Гукаапрат. ЗАПЛАДЭНСКІ і СОБАЛЕНСКІ.
У галоўн. ролях:
ХВЕДАР РЫБАКОНЬ—Г. В. МУЗАЛЕЎСКІ,
АН РЭЙ БАГУР—Ф. В. БЛАЖЭВІЧ,
ПАЛК. БЕЛАЎ—С. А. МАРШЭСОН,
ГАЛЕНА, ЯГО ЖОНКА—С. З. МАГАРЫЛЬ,
МАШЫНІСТ— ЗАСЛ. АРТЫСТ ТАРХАНАЎ.
ШОФЭР—А. ДЫМЕНТАЕЎ.
ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ.
ПАЧАТАК у 6, 7-30, 9 і 10-30. ДЗЕШ Ў КІНО НЕ ДАПУСКАЮЦЦА. КАСА зд і гадз.
Пасьля 3-га сеанса ўваход у залю зачынены.

„Інтэрнацыянал". Замежны фільм АБШАРПАНЫЯ ВЕТРАЗІ
ПРАЛЕТАРЫ. ПАТ і ПАТАШОН у камэдыі ПАТАШОН БОКСЭР (у адкрытым моры)
„СПАРТАК" Амэрыканскі фільм НЕБАСКРОБ камэдыя ў 6 частках.

28 сакавіка, роўна ў 19 гадз. у памяшканьні Камунар (Університэцкая, вул.) у гібінэце савецкага будаўніцтва (4-ты паверх)
— адбудзецца —
АГУЛЬНЫ СХОД
членаў таварыства марксістаў-дэкаршыўцаў.
Прысутнасьць усіх членаў т-ва абавязкова.
Запрашаюцца ініцыятыўныя групы па арганізацыі ячэек МП на прадпрыемствах і ўстановах, члены дэпутацкіх груп, савецкі актыў.
Праўленьне т-ва.

Вышаў з друку, паступіў у продаж і рассылаецца ўсім падпісчыкам
№ 3-4 „Бальшавік Беларусі" № 3-4
ЗЬМЕСТ
Ліст т. Сталіна Леніну.
Перадавая.—Работу прафсаюзаў на ўзровень задач апошняга году пяцігодкі.
Ю. Ленскі.—Чацьверты год крызысу ў Польшчы.
А. Гаруновіч.—За канкрэтнае кіраўніцтва арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў.
М. Гарын.—У барацьбе без клясавымі ворагамі і апартуністамі набудуем бязклясавае грамадзтва.
БІБЛІЯГРАФІЯ
Онур.—Сельскагаспадарчая эканоміка ў кандрацьеўскім асьвятленьні.
МАТАР'ЯЛЫ І ДАКУМАНТЫ.
Умовы падпіскі на 1932 год.
На 1 мес.— 40 к. На 6 мес.—2 р. 70 к.
На 3 мес.—1-20 к. На 12 мес.—4 р. 80 к.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважанымі па друку ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах БССР.

ВІЦЕБСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ
—). АБВЯШЧАЕ (—
ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ на 1-шы курс.
Умовы прыёму і дакумэнты звычайныя, як і ва ўсе тэхнікумы.
Прыём заяў да 1-га красавіка.
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Музычны магазын БЕЛГАНДЛЮ
(Менск, Ленінская, 9, тэл. 6-84)
атрымаў
медна-духавыя музычныя інструманты.
Да першамайскіх урачыстасьцяй заказы выконваюцца аркестрамі і ў разьбіўку.
БЕЛГАНДАЛЬ.

КРУГЛЯНСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае веснавы набор на 1-шы курс тэхнікуму і 1 га.
5-МЕСЯЧНЫЯ ВЭТФЭЛЬЧАРСКІЯ КУРСЫ.
На 1-шы курс тэхнікуму прымаюцца асобы, скончыўшыя семігодку, а на 5-месячныя курсы—асобы, скончыўшыя 5-6 груп сямігодкі. Студэнты і курсанты забясьпечваюцца стыпэндыямі і інтэрнатам.
Заявы прымаюцца на 1-шы курс тэхнікуму да 1-га красавіка, а на вэтфэльчарскія курсы—да 15 красавіка. Да заявы прыкладваюцца дакумэнты: аб сац. становішчы і паходжаньні, аб адукацыі, аб узросьце і стажы работы. Заявы падаюцца па адрэсе: м. Круглае, Талачынскага раёну, агратэхнікум.
Дырэктар.

РАЙКАНТОРЫ „РАДИОСТРОЯ" па БССР
у Калодзішчах, Менскага раёну
патрэбен ст. бухгальтар
Аплата па згодзе. Прадстаўляецца кватэра, апаленьне і асьвятленьне.
Тэрмін работы 3-9 месяцоў, а пры наяўнасьці належнай кваліфікацыі і дасканалага стажу—пастаянная работа ў Маскве.
Звяніць па тэлефону: Калодзішчы, „Радиострой".

У ЧЫГУНАЧНЫЯ ПРАФОРГАНЫ ВЫБРАЦЬ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ТРАНСПАРТУ

За працаздольныя мясцкомы

Перавыбары пізавых прафорганаў на чыгуначным транспарце, якія пачаліся з 15-га сакавіка, набываюць вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне. Вялізарныя пляны перавозак грузаў і пасажыраў патрабуюць ад кожнага пізавога прафзьвяна, ад кожнага ў цілособку чыгуначніка выключна выразнай і баявой работы.

Трэба адзначыць, што армія чыгуначнікаў сацыялістычнага транспарту БССР сустрэла магутнай хвалай энтузіязму справаздачна - перавыбарчую кампанію. У гэтым напрамку ўзорныя прыклады баявой падрыхтоўкі паказала гомельская прафарганізацыя 5-га эксплёатацыйнага раёну Заходніх чыгунак. Шляхам масавага ўдзелу лепшых ударнікаў-чыгуначнікаў у самаправерачных брыгадах па Гомельскім эксплёатацыйным раёне была зроблена генэральная праверка баяздольнасьці кожнага мясцкому, прафгрупы, як кожная пізавая праф'ячэйка змагалася за рэалізацыю 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, за трансфінпляны, за паляпшэньне культурна-бытавых умоў чыгуначнікаў і г. д. Аднак, на паасобных станцыях справаздачна-перавыбарчая кампанія разгарнулася зусім слаба. Гэта адносіцца ў асаблівасьці да мясцкомаў, лінейных станцый, пагрузачна-разгрузачных работ, складаў ашалу Жлобінскага і Віцебскага раёну. Ёсьць факты, калі ў паасобных мясцкомах удзел рабочых мас чыгуначнікаў амаль зусім не забясьпечан (Калінкавічы, Асіпавічы).

Умець спалучаць вытворчыя заачы прафсаюзаў з задачамі далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавога становішча чыгуначніка — важнейшая задача прафарганізацый. Трэба моцна ўдарыць па ўсіх тых, хто пагартуністычнаму ігнаруе выкананьне партыйных дырэктыў па гэтым важнейшым пытаньні.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія на чыгуначным транспарце БССР праводзіцца адначасова з усесаюзным конкурсам на лепшую прафгрупу. Гэтыя кампаніі зьяўляюцца адным з важнейшых этапаў у барацьбе за канчатковае ўзмацненьне прафсаюзнай работы, зьнічэньне парушэньняў працоўнай і прафсаюзнай дысцыпліны і канчатковага аздараўленьня чыгуначнага транспарту. Таму ў часе перавыбарчай кампаніі трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўкамплектаваньне пізавой прафгрупы моцнымі партыйна - вытрыманымі работнікамі, якія-б змаглі на справе ажыцьцявіць 6 умоў тав. Сталіна, перабудаваць усю прафработу і забясьпечыць пасьпяховае выкананьне трансфінпляну на сваім участку работы.

Перад сацыялістычным транспартам БССР, як і ўсяго Савецкага Саюзу, зараз наступае адказны перыяд, калі з дня ў дзень неабходна фарсаваць тэмпы перавозак пасажыраў, хутка і бесьперабойна прасоўваць маршруты з пасажырам, машынамі і ўчаснымі сацыялістычным палём. Перавыбарчая кампанія павінна забясьпечыць шырокі ўдзел плеяў саюзаў як у падрыхтоўцы да сяўбы, так і прасоўваньні пасеўных грузаў.

Перавыбары прафорганаў павінны прайсьці пад знакам шырокай мабілізацыі чыгуначнікаў на барацьбу за канчатковае аздараўленьне паравознай гаспадаркі шляхам актыўнага ўдзелу ва ўсесаюзным і ўсебеларускім конкурсе спараных брыгад, аздараўленьні вагоннай гаспадаркі і ўсіх зьвеньняў чыгуначнага транспарту.

Узначаліць барацьбу за пяршынства

Справаздачная кампанія пізавых прафарганізацый па 5-м эксплёатацыйным раёне (Гомельскі) заканчваецца. Яна праведзена, як сапраўды масавая палітычная кампанія. У 273 самаправерачных брыгадах прымала ўдзел 1.154 рабочых.

У перыяд справаздачнай кампаніі перабудавана сетка пізавых прафсаюзных зьвеньняў над кутом разбуйненьня іх і набліжэньня да вытворчасьці. На раёне зараз арганізавана новых 18 мясцкомаў.

Зараз пачаліся перавыбары Кампаніі перавыбараў песным чынам ўвязана з правядзеньнем 2-га ўсесаюзнага і ўсебеларускага конкурсаў спараных брыгад сталінскім паходам, з усесаюзным і дарожным конкурсамі на лепшую прафгрупу, прафорга і сэкцыю ПТР. Прафгрупы пад кіраўніцтвам т. т. Малютнікава і Скобелева, узяўшы шэфства над паравозамі, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, выклікалі на спаборніцтва астатнія прафгрупы і рамонтныя брыгады дэпо. У якасьці практычных мерапрыемстваў прафгрупа тав. Скобелева ліквідавала абязьлічку ў інструментальнай і перайшла на гаспадарчы разрахунак. Прафгрупа тав. Малютнікава абавязалася зрабіць пачарговы рамонты на падшэфных паравозах. Перад пачаткам работы ў гэтых прафгрупах праводзіцца выгворчыя нарады, на якіх абмяркоўваюцца пляны далейшай работы. Перабудова работы ў гэтых прафгрупах ужо дала станоўчыя вынікі. Паўторнасьць рамонту паравозаў па віне членаў прафгрупы поўнасьцю ліквідавана.

У часе самаправеркі работы прафарганізацый абвясьцілі сябе ўдарнікамі 317 рабочых, ахоплена прафсаюзным членствам 676 новых рабочых, паступіла заяў аб прыёме ў партыю і камсамол—96, тэхвучобай ахоплена 5.020 чал., сабрана рабочых прапаноў — 71 і г. д.

Вялікую работу правёў чыгуначны клюб імя Леніна. Створаная клюбам агітбрыгада правяла шырокую растлу масавую работу, мастацкі афармленую на прадпрыемствах і вузлох. 2 фізкультурных брыгады правялі масавы карнавал, прысьвечаны справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Клюбны актыў і кіраўнікі гурткоў былі прымацаваны брыгадамі да паасобных мясцкомаў для дапамогі ў рабоце. У кіно-тэатры праз кароткія інфармацыі і сьветавыя рэклямы вызначаліся галоўныя задачы кампаніі. Радыёстанцыя клюбу правяла перакліч мясцкомаў вузла аб ходзе работы на падрыхтоўцы да перавыбараў.

Вялікую работу правялі падшэфныя часьці Чырвонай арміі. Брыгады чырвонаармейцаў дапамагалі шэфам лепш правесьці кампанію перавыбараў.

Зараз перавыбары ў самым разгары. Лепшыя ўдарнікі — чыгуначнікі, камуністы і камсамольцы выбіраюцца ў склад мясцкомаў. Перад новавыбранымі мясцкомамі стаіць адказьнейшыя задачы ў справе барацьбы за выкананьне трансфінпляну, за пасьпяховае правядзеньне конкурсу спараных брыгад і далейшае разгортваньне сацыяборніцтва і ўдарніцтва.

Пад кіраўніцтвам партарганізацыі прафсаюзы Гомельскага чыгуначнага раёну, на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна дабіліся выкананьня і перавыкананьня трансфінпляну 4 заключнага году пяцігодкі. Н. Гафт.

Мінск, друкарня «Зьвязды».

Галоўлітбал № 337.